

«ЮНАЦТВА», ЗАГАРТАВАНАЕ МАРСКІМ КЛІМАТАМ ЧЫРВОНКА

«КУЗНЯ» БУДУЧЫХ ЖУРНАЛІСЦКІХ КАДРАЎ ЧЫРВОНКА




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

18 ЧЭРВЕНЯ 2020 г. ЧАЦВЕР № 117 (29231)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Павел ДРОЗД, генеральны дырэктар ДВА «Белэнерга»:**

*«Пасля ўводу ў дзеянне Беларускай АЭС экспартны патэнцыял беларускай энергасістэмы значна ўзрасце. Улічваючы пазіцыю Літвы па ўвядзенні забароны на гандаль электраэнергіяй пасля пачатку вытворчасці электраэнергіі на Беларускай АЭС, «Белэнерга» выказвае зацікаўленасць у развіцці ўзаемавыгадных гандлёвых адносін з Латвіяй, Польшчай і іншымі краінамі, у прыватнасці, для магчымасці экспарту электраэнергіі».*

## КОРАТКА

- **Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка азнаёміўся з рэканструкцыяй дзіцячай гарбальніцы ў Бабруйску.**
- На другім энергаблоку БелАЭС пачаты этап праліву сістэм на адкрыты рэактар.
- **У Мінску праектуюцца і будуюцца 44 аб'екты адукацыі.**
- Украіна адкрывае пункты пропуску на граніцы з Беларуссю і Расіяй.
- **Больш за 80 % выпушчанага сёлета БМЗ металу адгружана на экспарт.**
- Урад падоўжыў тэрміны дзеяння пасведчанняў па ахове працы.
- **У Беларусі ўпершыню за дзевяць гадоў знайшлі гняздо з птушанятамі беркута.**



- БНТУ да свайго стагоддзя правядзе эстафету юбілейнага агню па прадпрыемствах, дзе працуюць яго выпускнікі.


ISSN 1990 - 763X


# ГРУЗІЦЕ КЛУБНІЦЫ ВЁДРАМІ




Фота БелТА.

Не толькі вёдрамі, але і бочкамі. У клубнічнай сталіцы Беларусі — вёсцы Дварэц Лунінецкага раёна — пачаў працаваць аптовы кірмаш, на якім мясцовыя жыхары могуць прадаць свой ягадны ўраджай. Сёлета ён з-за надвор'я паспеў нашмат пазней, але попыт на яго не паменшаў — у Дварэц з'ехаліся нарыхтоўшчыкі з Брэсцкай, Гомельскай, Гродзенскай, Магілёўскай, Віцебскай абласцей.

Камунальныя стасункі

## ЗАЯЎКА З АСАБЛІВЫМ СТАТУСАМ

### Чаму вельмі важна камунальныя праблемы вырашаць праз службу 115

**Падчас нарады па пытаннях ЖКГ у Полацку Прэзідэнт адзначыў, што стварыць службу 115 было правільным рашэннем, але існаваць яна павінна асобна ад сістэмы ЖКГ. На прыкладзе Брэсцкай вобласці расказваем, як працуе абласны кантакт-цэнтр і чаму так важна пакідаць заяўку праз службу, а не па звычцы тэлефанаваць у дыспетчарскую ЖКГ.**

Брэсцкі адзіны абласны кантакт-цэнтр ЖКГ працуе з кастрычніка 2018 года, і спецыялісты паспелі прыняць амаль паўмільёна заявак ад спажыўцоў паслуг. Любы жыхар Брэстчыны можа патэлефанаваць на нумар 115 у любы час і не толькі пакінуць заяўку, але і атрымаць інфармацыю пра работу ЖЭС, пашпартнага стала ці адключэнне паслуг.

— Да службы 115 цяпер падключаны ўсе прадпрыемствы жыллёва-камунальнай гаспадаркі Брэсцкай вобласці, прычым не толькі тыя, што займаюцца абслугоўваннем дамоў ці аказваюць жыллёва-камунальныя паслугі, — расказвае **начальнік адзінага абласнога Кантакт-цэнтра ЖКГ Мікіта ПАНОЎ.** — Сярод іх ёсць і дарожнае прадпрыемства Брэста, і рамонтна-будаўнічае ў Баранавічах, і гарсавет Пінска.


СТАР. 3


Побач з намі

**Сяргей КОЎГАН:**

## «Я НАВУЧЫЎСЯ НЕ АСУДЖАЦЬ ЛЮДЗЕЙ...»



**У пошукава-выратавальны атрад «Анёл» людзі, што згубілі сваякоў, часам звяртаюцца нават раней, чым у міліцыю. З заснавальнікам і камандзірам самага вядомага ў нашай краіне добраахвотнага атрада па пошуку зніклых без вестак людзей Сяргеем Коўганам мы размаўляем пра тое, ці стала менш валанцёраў у сувязі з пандэміяй і як выжывае валанцёрская арганізацыя ў цяперашніх няпростых эканамічных умовах.**

**Складанасць пошукаў чалавека залежыць ад многіх фактараў. У горадзе цяжкасці стварае вялікая колькасць людзей, але тут можна супрацоўнічаць, напрыклад, са службамі таксі, расклеіць арыенціроўкі. А ў лесе самым важным фактарам з'яўляецца час.**


СТАР. 4



ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Блізкая ўлада

## НАЙБОЛЬШ ЗАПАТРАБАВАНАЯ І ЗРУЧНАЯ ФОРМА СТАСУНКАЎ ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ

**Падчас прамой тэлефоннай лініі і асабістага прыёму грамадзян, які правёў у Бярозаўскім раёне Брэсцкай вобласці начальнік галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Адміністрацыі Прэзідэнта Рыгор ШЛЫК, да яго звярнулася больш за дваццаць чалавек, паведамляе БелТА. Скарысталіся магчымасцю задаць пытанні, што іх хвалююць, і жыхары іншых рэгіёнаў. Сітуацыі ў людзей розныя: нехта сутыкнуўся з цяжкасцямі ў працаўладкаванні, запазычанасцю наймальніка па заработнай плаце, а хтосьці з жыллёвымі праблемамі і спадчыннымі спрэчкамі. Былі і тыя, каго хвалявалі грамадскія пытанні.**


Фота БелТА.

У прыватнасці, пенсіянер з Белаазёрска заклапочаны недахопам вузкіх спецыялістаў у медыцынскіх установах раёна. У выніку часам на абследаванне неабходна ездзіць у іншыя гарады. «Упэўнены, што мясцовыя ўлады ў курсе і адсочваюць сітуацыю, падаюць заяўкі. Імкнуцца прыцягнуць маладых спецыялістаў, прапаноўваючы ў тым ліку і жыллё», — сказаў Рыгор Шлык. Старшыня Бярозаўскага райвыканкама Леанід Мартынюк дадаў, што сёлета ў раён прыедзе 20 маладых урачоў.

Маці дваіх дзяцей расказала пра няпростую сітуацыю, у якую трапіла. З-за сямейных праблем жанчына страціла месца ў чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў. Цяпер яна жыве ў службовым інтэрнаце і шукае магчымасць атрымаць арэндную кватэру. Рыгор Шлык разам з кіраўніцтвам райвыканкама прапанаваў ёй алгарытм далейшых дзеянняў.

— Выязныя прыёмы грамадзян вельмі запатрабаваныя. Гэта аналіз не толькі Адміністрацыі Прэзідэнта. Па нашым даручэнні сацыялагічныя службы вывучылі пытанне. Больш за 60 працэнтаў грамадзян адзначылі, што такая форма стасункаў з насельніцтвам найбольш запатрабаваная і зручная для людзей. Сёлета мы паставілі задачу ахапіць выязнымі прыёмамі ўсе 118 раёнаў краіны, — кажа начальнік галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Адміністрацыі Прэзідэнта.

Рыгор Шлык таксама звярнуў увагу на тое, што сёлета адзначаецца змяншэнне колькасці зваротаў ва ўсіх рэгіёнах. На яго думку, у пэўнай ступені гэта заслуга мясцовых органаў улады, якія з улікам даручэнняў кіраўніка дзяржавы вырашаюць пытанні, што цікавяць і хвалююць грамадзян. Але казаць, што ўсё вырашана, пакуль рана. Ёсць шэраг пытанняў, над якімі неабходна працаваць, лічыць Рыгор Шлык.

Ва ўрадзе

## БУДАВАЦЬ БУДУЦЬ ХУТЧЭЙ І ТАННЕЙ

### Прыняцце ўказа аб рэнтабельнасці забудоўшчыкаў у пяць працэнтаў чакаецца ў найбліжэйшы час

**Намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір КУХАРАЎ наведаў прадпрыемства «Завод эфектыўных прамысловых канструкцый» у Мінску. Асноўным відам дзейнасці завода з'яўляецца выпуск бетонных і железабетонных вырабаў, у тым ліку і для будаўніцтва.**


Фота БелТА.

«Праект нарматыўнага прававога акта ўжо з усімі ўзгоднены і накіраваны на падпісанне. Чакаем, што ў найбліжэйшы час ён будзе прыняты. Мы сёння вельмі сур'ёзную ўвагу ўдзяляем менавіта патанненню будаўніцтва, павышэнню эфектыўнасці, зніжэнню выдаткаў на выпуск канструкцый», — сказаў Уладзімір Кухараў пра ўказ аб 5-працэнтнай рэнтабельнасці.

Для дасягнення гэтых мэт на заводзе сёння праводзіцца мадэрнізацыя, якая завершыцца да канца бягучага года. Удасканаліць работу, павысіць эфектыўнасць тэхналагічных ліній, знізіць затраты дапаможа сучаснае абсталяванне. Гэта, у сваю чаргу, станоўча адаб'ецца на кошце жылля.

«Ужо сёння разлікі паказваюць, што гэта будзе высокаэфектыўнае, энергаэфектыўнае жыллё, якое будзе адпавядаць неабходным спажывецкім якасцям. Акрамя таго, цяпер вядуцца распрацоўкі, каб на новых тэхналагічных лініях маглі вырабляць канструкцыі не толькі для жылля, але і для будаўніцтва школ, дзіцячых садкоў, бальніц», — дадаў віцэ-прэм'ер.

Будаўніцтва з прамысловых канструкцый зніжае не толькі тэрміны пабудовы жылля, але і яго кошт. Таму сёння перад прадпрыемствам, праектнымі арганізацыямі стаіць задача па павелічэнні будоўлі ў краіне сацыяльных аб'ектаў з эфектыўных прамысловых канструкцый.

Па словах Уладзіміра Кухарава, сітуацыя з пандэміяй значна не паўплывала на сферу. «Я думаю, што ўсе тыя задачы, якія пастаўлены перад будаўнічай галіной, будуць выкананы. Галіна працуе стабільна, вынікі пяці месяцаў паказваюць рост па будаўніча-мантажных работах. Так, дасягнуты вынік у 107,7 працэнта ў параўнанні з мінулым годам», — адзначае віцэ-прэм'ер.

Спецыялісты сферы актыўна працуюць па ўсіх кірунках: будаўніцтва жылля, прамысловых, сацыяльных аб'ектаў.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Фінансавая палітыка

# Не караць, а падтрымаць

### Банкі абвясцілі крэдытныя канікулы больш чым шасці тысячам кліентаў

**Усе мы, людзі, маем патрэбу ў разуменні і дапамозе. Менавіта такую высновy зрабіла Асацыяцыя беларускіх банкаў пасля аналізу мер, якія робяцца крэдытна-фінансавымі ўстановамі краіны па падтрымцы насельніцтва і рэальнага сектара эканомікі дзеля мінімізацыі негатыўных наступстваў, якія ўзніклі ў выніку складанай эпідэміялагічнай сітуацыі.**

Як адзначыў **прэс-сакратар асацыяцыі Павел СІМАНАЎ,** банкі працягваюць работу па крэдытаванні эканомікі і развіцці інвестыцыйных праектаў, аказваюць насельніцтву крэдытную падтрымку. Пры гэтым рэалізуецца комплекс мер, скіраваных на часовае зніжэнне пазыковай нагрузкі кліентаў — прадпрыемстваў і грамадзян, якія апынуліся ў складаным фінансавым становішчы ў сувязі з наступствамі пандэміі. Гэта забеспячэнне адтэрміноўкі пагашэння асноўнага доўгу і выплаты працэнтаў; прыпыненне налічэння працэнтаў; змяненне тэрмінаў пагашэння крэдыту; неспагнанне працэнтаў за несвоечасовае пагашэнне запазычанасці; рэфінансаванне крэдытаў на больш працяглы тэрмін; для прадпрыемстваў-экспарцёраў — перавод крэдытнай запазычанасці з замежнай валюты ў беларускія рублі.

Усяго сёлета ў сакавіку— маі банкі далі крэдытныя канікулы больш чым шасці тысячам кліентаў на суму каля двух мільярдаў рублёў. З іх каля 2,8 тысячы — гэта юрыдычныя асобы, 3,3 тысячы — фізічныя. Так, толькі найбуйнейшы банк краіны — Беларусбанк — задаволіў каля 90 працэнтаў просьбаў кліентаў са сферы малога і сярэдняга бізнесу аб рэструктурызацыі і растэрміноўцы крэдытаў.

Комплекс мер, які прымаецца банкамі з мэтай аказання дапамогі суб'ектам гаспадарання і грамадзянам, вельмі шырокі. Акрамя памяншэння пазыковай нагрузкі, гэта зніжэнне тарыфаў і бясплатныя пакеты паслуг для льготных праектаў са службамі дастаўкі, транспартнымі кампаніямі і іншымі сэрвісамі. Пры гэтым асаблівая ўвага ўдзяляецца найбольш пацярпелым галінам — турыстычнай, пасажырскім перавозкам, грамадскаму харчаванню. Напрыклад, БНБ-банк бясплатна абслугоўвае прадпрыемствы са сфер турыстычных паслуг і пасажырскіх перавозак, БСБ-банк распрацаваў бясплатны пакет паслуг «Мы разам!» для прадпрыемстваў грамадскага харчавання, МТБанк прапануе новым кліентам разліковa-касавае абслугоўванне са зніжкай 90 працэнтаў.

«Банкі і ў далейшым будуць прымаць усе неабходныя меры для падтрымання рэальнага сектара эканомікі і грамадзян і змяншэння для іх неспрыяльных наступстваў, выкліканых пандэміяй, — адзначыла **выканаўца абавязкаў старшыні Асацыяцыі беларускіх банкаў Ганна КАВАЛЁВА**. — Крэдытна-фінансавыя арганізацыі гатовыя нарошчваць аб'ёмы падтрымкі, але пры гэтым чакаюць павелічэння актыўнасці саміх кліентаў, якія часта, маючы праблемы з пагашэннем крэдыту, несвоечасова звяртаюцца ў банкі з адпаведным запытам. Акрамя таго, для мінімізацыі імавернасці адмовы ў крэдытных канікулах неабходна правільна падрыхтаваць і прадставіць у банк пакет дакументаў, які пацвярджае складанае фінансавае становішча».

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Улады Пекіна назвалі сітуацыю «надзвычай сур'ёзнай»




У кітайскай сталіцы абвясцілі пра ўвядзенне маштабных абмежавальных мер праз COVID-19, паведаміла выданне South China Morning Post. Сталічныя ўлады заклікалі ўсіх жыхароў адмовіцца ад «паездак не першай неабходнасці» і заставацца дома. Акрамя таго, усе пачатковыя і сярэднія школы ў Пекіне зачыняюцца, навучэнцы пераходзяць на дыстанцыйны рэжым навучання. Спыненая работа ўніверсітэтаў, а таксама ўсіх забаўляльных і спартыўных аб'ектаў. Аэрапорты Пекіна ўчора адмянілі каля тысячы ўнутраных рэйсаў. Напярэдадні вечарам кіраўніцтва кітайскай сталіцы павысіла ўзровень эпідэмічнай небяспекі з трэцяга да другога. У сераду ў горадзе захварэў на COVID-19 яшчэ 31 чалавек, а за апошнія сем дзён — 137. Да гэтага кітайская сталіца пражыла 57 дзён без адзінага выпадку мясцовага заражэння — вірус выяўляўся толькі ў прыезджых. Лічыцца, што крыніцай новай успышкі стаў велізарны аптовы рынак «Сіньфадзі», праз які паступае каля 80 % спажываных у 21-мільённым горадзе мяса і агародніны. CBS News адзначае, што новая ўспышка нагадвае сітуацыю ва Ухані ў студзені. Па словах галоўнага эпідэміёлага Кітая У Цзуньо, наступныя некалькі дзён будуць мець вырашальнае значэнне для разумення таго, як распаўсюджваецца вірус.

### У ААН папярэдзілі пра «пандэмію голаду» ў Лацінскай Амерыцы



У Сусветнай харчовай праграме (СХП) ААН заклікалі міжнародную супольнасць дзейнічаць хутка, каб крызіс з COVID-19 у Лацінскай Амерыцы не справакаваў голад, адзначыла газета The Guardian. «Мы сапраўды занепакоеныя гэтай тэндэнцыяй у галіне ахове здароўя. На жаль, у тым, што датычыцца сітуацыі з харчовай бяспекай, навіны не вельмі добрыя», — згадвае выданне словы кіраўніка падраздзялення СХП у краінах Лацінскай Амерыкі і Карыбскага басейна Мігеля Барэта. Паводле ацэнак арганізацыі, каранавірусны крызіс і выкліканыя ім абмежавальныя меры могуць справакаваць недахоп харчавання, ад якога пацерпіць каля 40 мільёнаў чалавек у краінах Паўднёвай і Цэнтральнай Амерыкі, а таксама Карыбскага басейна. Паводле звестак СХП, у 11 дзяржавах гэтага рэгіёна ў пачатку года звыш 3,4 мільёна чалавек сутыкнулася з вострым недахопам харчавання, а цяпер, праз амаль паўгода крызісу, іх ужо 14 мільёнаў.

### Трамп падпісаў указ аб рэформе паліцыі пасля хвалі пратэстаў



Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп падпісаў указ, скіраваны на рэфармаванне паліцыі і зніжэнне рызыкі супрацьпраўных дзеянняў яе супрацоўнікаў падчас аперацый. Пры гэтым амерыканскі лідар папярэдзіў: ён не згодны, што сілавікоў варта пазбавіць часткі фінансавання. «Амерыканцам патрэбна моцная паліцыя», — падкрэсліў Трамп. Прэзідэнт дадаў, што ў апошнія гады паліцыі ўдалося прыкметна знізіць узровень злачыннасці ў краіне. Трамп таксама падкрэсліў, што не дапусціць паўтарэння беспарадкаў, якія адбыліся падчас нядаўніх акцый пратэсту супраць дзеянняў паліцэйскіх. «Я гатовы працаваць з Кангрэсам над тым, каб прыняць і дадатковыя меры», — сказаў прэзідэнт ЗША. Паводле яго слоў, у краіне актыўна вядзецца распрацоўка новай эфектыўнай зброі, якая пры гэтым не ўяўляе сур'ёзнай пагрозы для жыцця.

На слыху

# ПАЦЫЕНТЫ З COVID-19 БУДУЦЬ АТРЫМЛІВАЦЬ БЯСПЛАТНЫЯ ЛЕКІ

**Інфекцыя COVID-19 унесена ў пералік захворванняў, якія даюць права на бясплатнае забеспячэнне лекамі. У прыватнасці, гэта датычыцца пацыентаў, якія маюць лёгкія і сярэдняцяжкія формы захворвання, у тым ліку няцяжкія пнеўманіі, і лечацца дома.**

Адпаведная пастанова Савета Міністраў дапоўнена пазіцыяй «Інфекцыя, выкліканая каранавірусам COVID-19».

Як нагадалі ў Міністэрстве аховы здароўя, цяпер частка пацыентаў з інфекцыяй COVID-19 атрымлівае лячэнне дома. Найперш гэта хворыя з лёгкімі і сярэдняцяжкімі формамі захворвання, у тым ліку няцяжкімі пнеўманіямі. Для больш эфектыўнага іх лячэння вызначаны пералік антыбактэрыяльных лекавых сродкаў, якія могуць быць прызначаны падчас лячэння дома.

Закупацца такія прэпараты будуць за кошт мясцовых бюджэтаў. У спіс увайшлі парацэтамол 500 мг, таблеткі; азітраміцын 500 мг і 250 мг, таблеткі, капсулы; амаксіцылін/клавуланавая кіслата 875/125 мг, таблеткі; кларытраміцын 500 мг, таблеткі; цэфураксім аксэціл 500 мг, таблеткі; левафлаксацын 750 мг, таблеткі.

У міністэрстве канстатуюць, што ў краіне добра сябе зарэкамендавала такая форма работы з пацыентамі, якія хварэюць на інфекцыйныя хваробы — напрыклад, туберкулёз, вірусны гепатыт, ВІЧ, — як кантраляванае лячэнне ў амбулаторных умовах. Яна прадугледжвае прыём прэпаратаў пад кантролем медыцынскага работніка (напрыклад, хворы можа здымаць прыём лекаў на смартфон і дасылаць медыку).

Прынятая згаданай пастановы дазволіць арганізаваць кантраляванае лячэнне пацыентаў з каранавіруснай інфекцыяй дома. Міністэрства аховы здароўя даручыла кіраўнікам устаноў аховы здароўя прыняць меры па арганізацыі такога лячэння.

Па звестках на 17 чэрвеня, у Беларусі зарэгістравана 56 032 чалавекі са станоўчым тэстам на COVID-19. Паправіліся і выпісаны 32 735 пацыентаў, 324 чалавекі памерла. Усяго праведзена 778 935 тэстаў. За апошнія суткі прырост склаў 663 інфіцыраваныя, 1462 пацыенты выпісаны, шэсць чалавек памерла. Праведзена 18 386 тэстаў.

**Алена КРАВЕЦ.**

Культасвета

# «Мы не можам падвесці гледачоў»

## «Славянскі базар — 2020» скарачаецца, але не адмяняецца

**29-ы па ліку Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» пройдзе сёлета з 16 да 20 ліпеня ў новым фармаце і, паводле слоў міністра культуры Юрыя БОНДАРА, мае ўсе шанцы стаць адным з самых маштабных open air-аў у Еўропе.**

Справа ў тым, што, з улікам умоў, якія складваюцца ў Беларусі і ў свеце, мастацкі форум выйдзе з закрытых памяшканняў на вуліцы і плошчы, у дворыкі і паркі Віцебска. Так, на галоўнай адкрытай пляцоўцы фэсту — у Летнім амфітэатры — адбудуцца сем самых маштабных праграм: канцэрты адкрыцця і закрыцця «Славянскага базару», конкурс маладых выканаўцаў «Віцебск-2020» (у ім, як плануецца, выступяць прадстаўнікі 18 краін свету, а другі конкурсны дзень упершыню сумесцяць з канцэртам закрыцця фэсту, каб гледачы маглі ўбачыць жывыя, непадробныя эмоцыі артыстаў), канцэрт «Саюзная дзяржава запрашае...», складзены з кінашлягераў, а таксама праграмы «Залаты хіт», «Шансон ТБ — усе зоркі» і зборны канцэрт «Рок на ўсе часы».

Што да дзіцячага міжнароднага конкурсу «Віцебск-2020», у якім заяўлены юныя выканаўцы з 21 краіны свету, то ён пройдзе на новай пляцоўцы — адкрытай сцэне, якую спецыяльна ўзводзяць каля КЗ «Віцебск». Арганізатары прызнаюцца: доўга спрачаліся, ці не лепш будзе ладзіць конкурсы ў анлайн-фармаце, але потым вырашылі, што было б несумленна пазбаўляць пераможцаў нацыянальных адбораў магчымасці выступіць перад публікай. Тым больш у дырэкцыі фестывалю абяцаюць на сто працэнтаў выконваць усе рэкамендацыі Міністэрствам аховы здароўя меры бяспекі для артыстаў і гледачоў. Але як быць замежным удзельнікам «Славянскага базару», калі да сярэдзіны ліпеня іх краіны яшчэ не адкрыюць граніцы? «Мы ўжо месяц у рэспубліканскім аргкамітэце працуем над гэтым пытаннем, — запэўнівае **дырэктар фестывалю Глеб ЛАПІЦКІ**, — у шчыльным кантакце з усімі дзяржаўнымі структурамі, ад Мінздароўя і Мінкультуры да МЗС. Двойчы на тыдзень адсочваем бягучую эпідситуацыю, разглядаем магчымасці эксклюзіўных дамоў з дзяржавамі — удзельніцамі фестывалю, і пакуль што няма насцярожанасці, што нехта з артыстаў не зможа прыехаць».

На жаль, дзеля новага фармату некаторымі мерапрыемствамі давялося ахвяраваць. Адменены ўся тэатральная праграма, КВЗ-канцэрт, а таксама раней заяўленыя ў закрытых залах «сольнікі» артыстаў (апошніх арганізатары запрасілі ў зборныя канцэрты). Абноўленая праграма ўжо размешчана на афіцыйным сайце fest-sbv.by. Пры гэтым, адзначыў Юрый Бондар, з рэалізаваных раней амаль 15 тысяч білетаў (больш за 1000 набылі замежнікі) падчас «стадыі неакрэсленасці», ці будзе наогул «Славянскі базар у Віцебску» і ў якім рэжыме ён пройдзе, у касы было здадзена не больш за 70. «Гэта сведчыць пра тое, што і жыхары Віцебска, і замежнікі гэтага свята чакаюць, і падвесці чаканні гледачоў было б няправільна», — перакананы міністр.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# ЗАЯЎКА З АСАБЛІВЫМ СТАТУСАМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

А ў хуткім часе мы падключым да службы і тавараўстве ўласнікаў — ужо ідзе работа ў гэтым кірунку, праўда, пакуль з-за эпідэміялагічнай сітуацыі даволі павольна.

Кругласутачна прымаюць заяўкі 18 дыспетчараў, якія працуюць пазменна, — звычайна восем чалавек днём і два ноччу. Аднак, напрыклад, на пачатак ацяпляльнага сезона прыходзіцца пік заявак, іх колькасць у змену значна павялічваецца і даводзіцца прыцягваць да работы іншых спецыялістаў цэнтра. Павялічваецца ў такія моманты і час чакання адказу спецыяліста: калі сёлета ў маі ўжо у сярэднім чакаў адказу 17 секунд, то ў пік гэта можа заняць хвіліну, а ў пачатку ацяпляльнага сезона — нават і ўсе пяць.

— Амаль у 80 працэнтаў званкоў злучэнне адбываецца праз 20 секундаў, аднак у пік час чакання можа вырасці, — адзначае і Мікіта Аляксеевіч. — Звычайна колькасць заявак павялічваецца з 9 гадзін раніцы і да абеду. У суткі мы можам прымаць больш за 1000 заявак.

Асноўная іх частка прыпадае на электра- і водазабеспячэнне, бытавыя паслугі. Зімой, калі кароткі сонечны дзень, найбольш актуальныя пытанні з электразабеспячэннем на лесвічных клетках, у дварах і на вуліцах. Летам жа часцей за ўсё людзі звяртаюцца ў кантакт-цэнтр з праблемамі водазабеспячэння, бо ў гэты перыяд значна павялічваецца спажыванне вады.

Канешне, дыспетчарскія службы захаваліся і на самых прадпрыемствах, бо ў іх ёсць шырокі спектр абавязкаў, аднак заяўкі ад жыхароў прымае ўжо служба 115. У сваю чаргу, спецыялісты прадпрыемства ЖКГ, якія павінны яе выканаць, могуць пры неабходнасці патэлефанаваць чалавеку, які пакінуў гэтую заяўку, напрыклад, калі ім трэба трапіць у кватэру ўласніка. Працэс выканання заявак спецыялістамі кантралююць на розных узроўнях — гэта робіць і спецыялісты кантакт-цэнтра, і мясцовыя ўлады, якія перыядычна атрымліваюць усю статыстыку па рэгіёнах і нават могуць адсочваць усе заяўкі анлайн.

— Нашы спецыялісты павінны выконваць пэўную колькасць выходных званкоў у дзень, і звычайна 10 працэнтаў заявак пасля гэтага адпраўляецца на дапрацоўку. У такіх выпадках, калі прадпрыемства закрыла заяўку, але не выканала, яна потым атрымлівае асаблівы статус, і праграма ўжо наогул не дазваляе выканаўцу закрыць заяўку — гэта робяць нашы дыспетчары толькі пасля таго, як будуць упэўнены, што яна сапраўды выканана, — тлумачыць Мікіта Паноў. — Стварэнне кантакт-цэнтра, службы 115 дазволіла значна павысіць якасць паслуг у вобласці, прадпрыемствы сталі лепш працаваць, бо цяпер іх могуць кантраляваць на розных узроўнях. Гэта робіць і дыспетчар, і сам спажывец, і мясцовыя органы ўлады. Калі параўноўваць пяць месяцаў мінулага і гэтага года, то ў 2020-м камунальныя сталі ў два разы радзей парушаць тэрміны выканання заявак, і гэта вельмі важна.

Акрамя кароткага нумара 115 у Брэсцкай вобласці, як і па ўсёй Беларусі, працуе інтэрнэт-партал «Мая рэспубліка 115.бел». Яго ідэя заключаецца ў супастаўленні фатаграфій да і пасля выканання работ. Калі чалавек бачыць нейкую праблему на гарадской ці жылой тэрыторыі, то можна проста сфатаграфаваць яе і адправіць запыт праз мабільную праграму ці на сайт 115.бел. Пасля выканання работ спецыялісты ЖКГ павінны зрабіць кантрольнае фота і таксама адправіць яго на сайт.

— Аднак вельмі важна разумець, што спецыяліст не можа закрыць заяўку, пакуль не прымацуе да яе сваю фатаграфію, і таму мы просім жыхароў пакідаць толькі тыя фота, да якіх можна прымацаваць фота ў адказ, — адзначае начальнік цэнтра. — Пры гэтым аператыўнасць выканання заявак на партале пакуль саступае ў хуткасці рашэнню праблем праз кантакт-цэнтр, таму, калі людзі ўбачылі адчынены люк ці цечу вады з-пад зямлі, лепш паведаміць пра гэта на кароткі нумар 115.

**Валерыя КІСЛАЯ.**

Крымінал, здарэнні

# ВАЕННЫ АРСЕНАЛ У ЛЕСАПАСАДЦЫ

**У дзяжурную часць Маскоўскага РАУС Брэста паступіла паведамленне ад жыхара горада аб знойдзеным боепрыпасе. Падчас прагулкі ў лесапасадцы па вуліцы Газдзецкага мужчына ўбачыў металічны аб'ект, які нагадваў ваенны снарад.**

На месца здарэння неадкладна выехалі супрацоўнікі раённага аддзела і сапёрна-піратэхнічная група в/ч 5526. Паводле ацэнкі спецыялістаў, знойдзены прадмет з'яўляецца мінамётнай мінай.


Фота з сайта УУС Брэсцкага аблвыканкама.

Для бяспекі тэрыторыю аператыўна перакрылі. Як паведамляе УУС Брэсцкага аблвыканкама, падчас абследавання мясцовасці на прадмет наяўнасці іншых выбуховых прылад вайскоўцы выявілі яшчэ 30 мінамётных мін калібрам 120 міліметраў.

Усе боепрыпасы часоў Вялікай Айчыннай вайны. Арсенал паспяхова знішчаны.

УУС нагадвае: калі вы выявілі боепрыпасы, якія захаваліся з ваеннага часу, неадкладна паведамляйце ў міліцыю і ні ў якім разе не чапайце іх. Памятайце, што самастойныя дзеянні могуць справакаваць выбух і прывесці да фатальных наступстваў.

# ХАЦЕЎ СПАЛІЦЬ АЎТО КАЛЕГІ ЗА ТОЕ, ШТО НЕДАПЛАЦІЎ

**Супрацоўнікамі аддзела крымінальнага вышуку Кастрычніцкага РУУС Мінска затрыманы 38-гадовы гараджанін, які пашкодзіў аўтамабіль.**

Да супрацоўнікаў міліцыі звярнуўся мужчына, растлумачыўшы, што цягам ночы яго транспартны сродак падпалілі. Як паведаміў сам пацярпелы, пад падазрэнне трапіў яго калега па рабоце.

Аператыўнікі ў ходзе правядзення разбору ўстанавілі, што да падпалу машыны датычны 38-гадовы мінчанін.

Паводле аператыўнай інфармацыі ГУУС Мінгарвыканкама, падазраваны доўгі час працаваў у падначаленні пацярпелага. Паміж мужчынамі часта ўзнікалі канфлікты з нагоды нявыплачаных грошай за выкананую работу. Пры сустрэчы падчас чарговага ўзніклага канфлікту падазраваны запрыкмеціў аўто, на якім прыехаў былы калега. У той жа вечар ён накіраваўся па месцы жыхарства пацярпелага, якое яму было вядома раней, і каля дома знайшоў неабходную машыну. З мэтай падпаліць транспартны сродак мінчанін абліў яго вадкасцю для распальвання вогнішчаў, якую загадзя набыў у краме, і чыркнуў запалкай. Але паколькі аўтамабіль не загарэўся, падазраваны пачаў падпальваць асобныя яго элементы.

У выніку ў машыны былі пашкоджаныя колы, капот і дах. Агульная сума нанесенай шкоды склала каля 3000 рублёў.

Вядома, што мінчанін раней да крымінальнай адказнасці не прыцягваўся.

# ПАДЛЕТАК ЗРАБІЎ ГЭТА ДЗЕЛЯ ХАЙПУ

**На хлопца склалі пратакол за дробнае хуліганства, паведаміла аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гомельскага аблвыканкама.**

У адной з сацсетак з'явіўся відэаролік: хлопец у падпаленым на сабе адзенні кідаецца ў вадаём. Аказалася, усё было знята ў Гомелі. Мясцовая міліцыя ўстанавіла асобу маладога чалавека, які расказаў, што такім чынам хацеў праславіцца.

Напярэдадні «фаершоу» 17-гадовы ліцэіст прыдумаў, як стаць папулярным. Для гэтага купіў бензін, узяў дома старыя рэчы і адправіўся на гарадскі пляж. Там юнак пераадзеўся, абліўся бензінам і падпаліў сябе. Аднак спроба аказалася няўдалая — агонь згас да таго, як хлопец дабег да вады. Цалкам ажыццявіць задуманае яму ўдалося толькі з пятага разу. Усе дзеянні непаўналетняга зняў на мабільны тэлефон яго таварыш.

У дачыненні да героя відэа супрацоўнікамі ІСН Цэнтральнага РАУС Гомеля складзены адміністрацыйны пратакол за дробнае хуліганства. Дакумент разгледзяць на пасяджэнні камісіі па справах непаўналетніх.

Раней малады чалавек прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці за ўжыванне спіртных напояў у грамадскім месцы, з ім праводзілася індывідуальна-прафілактычная работа. Хлопец са шматдзетнай сям'і. У ліцэі вучыцца здавальняюча.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# «Я НАВУЧЫЎСЯ НЕ АСУДЖАЦЬ ЛЮДЗЕЙ...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Чым хутчэй наступае зварот, што чалавек знік, тым больш эфектыўныя пошукі і тым большая імавернасць знайсці яго жывым, — расказвае Сяргей Коўган. — Ён не паспеў змерзнуць, загінуць, памерці ад таго, што не прыняў медыцынскія прэпараты пры наяўнасці хранічных захворванняў (як гэта часта бывае ў пажылых людзей). Заканамернасць прамая. У першыя суткі шанцы знайсці чалавека жывым складаюць больш за 90 працэнтаў, на другія можна аднімаць 30 працэнтаў, на трэція — яшчэ столькі ж... Калі пра знікненне заявілі адразу, мы аператыўна выязджаем на месца і, як правіла, амаль заўсёды знаходзім чалавека — і часцей жывога. А калі, напрыклад, гэта адзінокая бабуля, якая жыве ў вёсцы, і суседзі толькі праз некалькі дзён заўважылі, што яе няма, то, вядома, імавернасць адшукаць пажылую жанчыну жывой рэзка зніжаецца.

Часта людзі распачынаюць самастойныя пошукі, а каштоўны час сыходзіць, кажа Сяргей.

— Так было і з нядаўна зніклым у Бабруйскім раёне трохгадовым хлопчыкам. Гэта зразумела: здаецца, зараз мы пабегаем і знойдзем дзіця, не мог жа малы далёка сысці. А потым аказваецца, што прайшло няма-ла часу. Таму я заўсёды тлумачу: адразу ж тэлефануйце ў экстранныя службы. Лепш спыніць пошукавыя мерапрыемствы, калі чалавек знойдзецца, чым пачынаць пошукі праз дзень або некалькі дзён.

## У сувязі з пандэміяй губляцца сталі менш

Асаблівасць работы пошукава-выратавальных атрадаў — тое, што кожны раз усё даводзіцца пачынаць спачатку. Падрыхтаваныя спецыялісты «Анёла» прыбываюць на месца першыя, каб разгарнуць штаб, сустрэць добраахвотнікаў і скаардынаваць іх работу. Далей — уводны інструктаж з валанцёрамі, большасць з якіх раней ніколі не займалася пошукамі людзей, тэхніка бяспекі, ацэнка магчымасцяў добраахвотнікаў і размеркаванне абавязкаў.

***— Ці могуць адмовіць добраахвотніку: маўляў, вы нам не падыходзіце, ідзіце дадому?***

— Могуць. Але не «ідзіце дадому», а прапануюць тую дзейнасць, дзе валанцёр будзе найбольш карысны.

На заклік «Анёла» адгукаюцца самыя розныя людзі. Часам — з хранічнымі захворваннямі, або ва ўзросце, або няправільна экіпіраваныя: зразумела, што дзяўчына на абцасах у лес ісці не можа. Але патрэбная і важная работа знойдзецца для ўсіх: апытанне сведак, расклейка арыенціровак, гатаванне ежы для пошукавых груп, дапамога ў зарадцы і абслугоўванні абсталявання, кантроль спісаў людзей, якія прыехалі на пошукі, запіс іх мабільных тэлефонаў, узаемадзеянне з міліцыяй і МНС.

— Многія хочуць дапамагчы, але не ведаюць, як гэта зрабіць. Наша задача — правільна арганізаваць добраахвотнікаў. І акцэнт робіцца на бяспеку, на мінімізацыю рызыкаў. Мы ў адказе за тых людзей, якіх паклікалі. Магу з задавальненнем сказаць, што ў нас не было падчас пошукава-выратавальных аперацый (ноччу, на вадаёмах, у лесе) ніводнага надзвычайнага здарэння.

Падрыхтаваныя спецыялісты, пра якіх кажа Сяргей, — гэта старшыя груп, якія вядуць добраахвотнікаў на пошукі. А задачы старшым груп ставіць каардынатар. Сваіх спецыялістаў «Анёл» навучае і выхоўвае сам — інфармацыя пра курсы і «баявыя» вучэнні размяшчаецца на сайце атрада.

***— А ці ёсць адбор па здароўі, фізічных даных, узросце?***

— У нас не армія і не міліцыя. Але вучыцца да нас, як правіла, прыходзяць людзі пэўнага складу — паляўнічыя, рыбакі, страйкбалісты, вайскоўцы, спартсмены. У 90 працэнтах выпадкаў гэта людзі, якія ўжо маюць нейкую падрыхтоўку і, вядома, матывацыю. Балерына наўрад ці прыйдзе да нас навучацца. У валанцёры — можа быць, але не на курсы па пошуку людзей... Так што адбор адбываецца аўтаматычна.

— І не думайце, што многія жадаюць вучыцца на нашых курсах, — дадае Сяргей.

— Калі прападае дзіця, людзі актыўна дапамагаюць. Але калі ў сезон губляюцца ў лесе бабулі і дзядулі, грамадства да гэтага прывычаілася. Гэта ўжо статыстыка. І сабраць валанцёраў для пошукавых мерапрыемстваў бывае складана. Многія проста маральна не гатовыя паехаць на пошукі. Знік чалавек — гэта бяда. Але гэта ж не ваш сваяк... Людзі, якія адказваюць на наш заклік, — гэта тыя, для каго чужая бяда як свая.

Восем гадоў таму пошукава-выратавальны атрад «Анёл» пачаўся з аднаго неабыякавага чалавека.

— У 2012 годзе я пачуў зварот жанчыны па тэлебачанні. У яе знік бацька сталага



ўзросту. Жанчына страціла надзею яго знайсці і вырашыла звярнуцца да суайчыннікаў, каб людзі прыехалі і ўзялі ўдзел у пошуках. Я зразумеў: трэба дапамагчы. Але калі прыбыў на месца сустрэчы, аказалася, што я і мой сябар былі адзіныя з добраахвотнікаў. Пасля гэтага я вырашыў, што трэба нешта рабіць, — расказвае Сяргей.

Сябра тады ўзяў з сабой «за кампанію» — аднаму было дыскамфортна, успамінае суразмоўнік: незразумела, куды едзеш і чым зможаш дапамагчы.

— Таму я сёння разумею валанцёраў, якія ўпершыню ўдзельнічаюць у пошукава-выратавальных мерапрыемствах. Яны разгубленыя, адчуваюць няўпэўненасць... Калі знаёмішся з валанцёрамі бліжэй, яны кажуць: «Мы баяліся. Думалі, тут байцы з суперпадрыхтоўкай». Але паступова людзі пачынаюць размаўляць паміж сабой, становяцца не такія напружаныя... Пошукавыя атрады ва ўсім свеце згуртаваныя агульнай ідэяй. Нашы валанцёры — гэта людзі з добрай матывацыяй, якія сапраўды імкнуцца дапамагчы. Да нас не прыязджаюць ад няма чаго рабіць.

У 2012 годзе аналагаў пошукава-выратавальнага атрада ў нашай краіне не было. «Анёл» ствараўся метадам спроб і памылак. Пачаўся ён з групы ў сацсетках. Сяргей скончыў прафесійныя курсы ў Расіі, і вельмі хутка пачалі паступаць запыты ад зусім незнаёмых людзей з просьбамі аб дапамозе, а «Анёл» пачаў абрастаць камандай.

Сёння на афіцыйнай заработнай плаце ў «Анёле» чатыры чалавекі, усе астатнія дапамагаюць добраахвотна — дайверы, кінолагі, прафесіяналы, якія валодаюць спецыяльнымі пошукавымі навыкамі.

***— У сувязі з COVID-19 валанцёраў стала менш?***

— Не заўважаю, што з прычыны пандэміі стала менш добраахвотнікаў. У нас жа ў краіне не ўводзіліся каранцінных мер. Вялікая праблема была ў Расіі — валанцёрам выдаваліся спецыяльныя пропускі, каб яны маглі выязджаць на пошукавыя мерапрыемствы. У нас ёсць патрабаванне: у службовым транспарце і ў памяшканнях усім знаходзіцца ў масках, а на адкрытым паветры — вытрымліваць сацыяльную дыстанцыю.

А вось губляцца ў сувязі з пандэміяй людзі сталі менш. Але ж самая актыўная для «Анёла» пара яшчэ наперадзе.

## Каго ратуе «Анёл»

Людзі, якіх часцей за ўсё даводзіцца шукаць, — гэта ўмоўна чатыры групы: дзеці, бабулі і дзядулі (нярэдка са стратай памяці), асобы, схільныя да суіцыду, і людзі з псіхічнымі захворваннямі. Існуе сезоннасць: людзі губляюцца перад вялікімі святамі і пасля іх, падчас масавых карпаратываў на прыродзе, у час летняй спякоты, веснавой рыбалкі і ў пачатку зімы, калі лёд яшчэ ненадзейны, у сезон збору грыбоў і ягад.

***— Вы знаходзіце ўсіх, хто прападае?***

— На жаль, не. Але 95-98 працэнтаў — знаходзім. Часам праз пяць, дзесяць і нават дваццаць гадоў пасля таго, як яны згубіліся. У нас напрацаваны сувязі з калегамі ў іншых краінах і ў Беларусі (акрамя «Анёла» існуе гомельскі «Сімуран», атрад «Анёл — Паўночны Захад»), створаны нашы прадстаўніцтвы больш чым у дзесяці беларускіх гарадах. Зыходзячы з вопыту, як толькі мы атрымліваем зыходную інфармацыю, ужо можам сказаць, знойдзем гэтага чалавека ці не, а калі знойдзем — то жывым або нежывым. Мы не медыкі. Наш прынцып — пры магчымасці выратаваць, пры немагчымасці — знайсці.

***— А ці часта вы знаходзіце людзей нежывымі? Напэўна, добраахвотнікі псіхалагічна не гатовыя да такога выпрабавання?***

— Здараецца, мы знаходзім людзей мёртвымі, менавіта таму працуем у цеснай сувязі з міліцыяй. А што датычыцца тых, хто знаходзіць мёртвае цела... Нашы людзі ведаюць, куды едуць. У пачатку пошукавых мерапрыемстваў паведамляем ім, каго шукаем і ў якім стане можам яго знайсці. Людзі павінны разумець, што імавернасць знайсці нежывога чалавека ёсць. Магчыма, хтосьці не гатовы пайсці далей, тады застаецца ў штабе і дапамагае каардынатару. У больш вопытных добраахвотнікаў іншае стаўленне да пошукаў: яны вераць, што аказваюць дапамогу сям'і таго, хто загінуў, спыняюць яе пакуты.

Часам, кажа Сяргей, ратавальнікі з «Анёла» разумеюць, што шукаюць менавіта мёртвага чалавека, але ад пошукаў не адмаўляюцца. Так было некалькі дзён таму, калі атрад выехаў на пошукі сямнаццацігадовага хлопца, які, па словах сведак, патануў у возеры. Вядома, сёстры і маці хлопца спадзяваліся, што сведкі памыліліся... Але цуд не адбыўся — вадалазы паднялі цела са дна.

***— Значыць, цуд немагчымы?***

— Цуд магчымы заўсёды ... Але цуд на тое і цуд, каб здарацца рэдка. Чалавек, які звяртаецца да нас, заўсёды спадзяецца, што яго блізкі жывы. Гэта ахоўная рэакцыя. Таму ў некаторых нашых падрыхтаваных спецыялістаў з цягам часу здараецца выгаранне, склад валанцёраў кожны раз на 90 працэнтаў новы, а людзі, якім мы калісьці дапамаглі знайсці блізкага, амаль ніколі не прыязджаюць да нас добраахвотнікамі. Думаю, яны проста не гатовыя перажыць гэта зноў. За гады работы ў «Анёле» я навучыўся не асуджаць людзей. Але хацелася б, каб яны былі больш спагадлівыя. Якія б вы не былі пільныя, не трэба думаць: «Са мной такога не здарыцца». Не толькі ў лесе, але нават у горадзе — здавалася б, знаёмым і бяспечным асяроддзі — можна згубіць блізкага чалавека: дзіця, пажылых маці, бацьку. Практычна ўсе, хто звярнуўся да нас, кажуць адну і тую ж фразу: «Мы ніколі не думалі, што такое можа адбыцца з намі».

## «Лайкі» нічым не дапамогуць

Пра «Анёл» пішуць часта, і ў асноўным з клічнікамі. Моцныя, прафесійныя, ратуюць людзей. Маюць унікальнае абсталяванне, якога няма часам нават у афіцыйных спецыяльных устаноў.

Між тым «Анёл» — гэта валанцёрская арганізацыя, якая існуе выключна на ахвяраванні і не вельмі частую спонсарскую дапамогу. І наўрад ці людзям прыходзіць у галаву, колькі каштуе кожнае пошукавае мерапрыемства.

— Дзякуючы артыкулам пра нас у людзей складваецца ўражанне, што ў «Анёла» ўсё ў парадку, — кажа Сяргей. — Напэўна, мне трэба казаць не толькі пра нашы поспехі, але і пра тое, што мае супрацоўнікі месяцамі не атрымліваюць зарплату, што часта мы з цяжкасцю знаходзім сродкі на аплату арэнды нашага памяшкання, што, здараецца, няма паліва на выезды і няма чым карміць валанцёраў падчас пошукава-выратавальных мерапрыемстваў... Калі людзі хочуць быць датычныя да добрай і патрэбнай справы, але паехаць на пошукі не могуць, — хай ахвяруюць два рублі нам на паліва, а не ставяць «лайкі». Так і напішыце: «лайкі» нічым нам не дапамогуць у выратаванні чалавечага жыцця. Гэта гучыць груба, але гэта праўда.

***— Ці сталі сёння людзі больш спагадлівыя, чым восем гадоў таму, калі ствараўся «Анёл»?***

— Наўрад. Асабліва апошнім часам. У людзей няма грошай, няма ўпэўненасці. Ім ужо складана не да чужых бед. Тым больш колькі іх, гэтых праблем!.. Хворыя дзеці, анкалагічныя захворванні, хтосьці збірае на аперацыю, у кагосьці згарэў дом... Я разумею, што пошук людзей — проста адна з усіх гэтых сацыяльных праблем. І ў кагосьці яны больш глабальныя. Іншы раз мы размаўляем з кіраўніцтвам прадпрыемстваў і чуем у адказ: у нас ёсць выбар — дапамагчы вам ці дзіцячаму хоспісу. Я кажу: дапамажыце хоспісу. На сябе мы, напэўна, знойдзем сродкі — прынамсі, будзем змагацца... Але што рабіць, калі грошы знайсці не атрымаецца? «Анёл» стане не настолькі эфектыўны. Мы не зможам дапамагчы ўсім, хто мае ў гэтым патрэбу. У нас няма камерцыйнай дзейнасці, мы існуем на ахвяраванні, а ахвяраваць можна, толькі калі ў цябе самога нешта ёсць. Сёння ў многіх людзей і арганізацый проста няма магчымасці займацца дабрачыннасцю. Мы не агітуем і не заклікаем усіх і кожнага дапамагаць нам матэрыяльна або выязджаць валанцёрамі на пошукава-выратавальныя мерапрыемствы — гэта справа добраахвотная. Проста, як правіла, людзі не задумваюцца аб такіх рэчах, пакуль не сутыкнуцца з імі самі. Час ад часу кожнаму з нас патрэбен анёл. Для гэтага мы і працуем.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

**Зрабіць унёсак у пошук людзей і падтрымаць пошукава-выратавальны атрад «Анёл» можна пры дапамозе:**

*** электроннага плацяжу праз Адзіную разліковую інфармацыйную прастору (АРІП), код паслугі 4345671.**

*** USSD-запыту *222*13# для абанентаў МТС, А1, life:) — з вашага рахунку спішацца два рублі.**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
18 ЧЭРВЕНЯ 2020 г.
ЧАЦВЕР
№ 11 (15888)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

*Імёны*

Іван ПРЫТКОЎ:

# «КАЛІ САБЕ ПАСТАЎЛЮ МЭТУ — УСЁ ЗМАГУ»



**Беларускія пяціборцы прывучылі балельшчыкаў да прыемных эмоцый — яны рэгулярна заваёўваюць высокія ўзнагароды на міжнародных спаборніцтвах. Напрыклад, у 2019 годзе ў іх скарбонцы было 22 медалі рознай вартасці ў розных узроставых катэгорыях. Прыемна, што ўзнагародамі радуюць не толькі дарослыя спартсмены, але і юнакі. Гэта сведчыць пра тое, што існуе пераемнасць, ёсць каму працягнуць добрую традыцыю. Адзін з самых прыкметных юніёраў-пяціборцаў на сёння, Іван Прыткоў, на сваім першым юнацкім чэмпіянаце Еўропы заваяваў адразу тры ўзнагароды, працягнуў поспех і на чэмпіянаце свету, стаўшы яго прызёрам. Пра пачатак сваёй кар'еры і вялікія планы на будучыню Іван расказаў у сваім інтэрв'ю.**

***— Як вы трапілі ў прафесійны спорт?***

— У дзяцінстве вельмі хацеў плаваць. З бацькамі знайшлі басейн побач з домам, але яго зачынілі на рамонт. Тады перайшоў у іншы — на той час мне было гадоў 9. Там спадабаўся трэнерам, і яны ўзялі мяне ў пяцібор'е. Спачатку проста вучыўся плаваць. Стала атрымлівацца: на першым жа спаборніцтве ў дваябор'і паказаў шосты вынік, а на другім сваім турніры заваяваў ужо «золата». Наогул наш від спорту падзяляецца па ўзроставых катэгорыях. Усё пачынаецца з дваябор'я (плаванне, бег), паступова дадаюцца астатнія віды (стральба, фехтаванне, конны спорт). Маім кароным відам з самага пачатку быў бег.

***— Спакусы перайсці ў лёгкую атлетыку не было?***

— Была, і гэта нават прапаноўвалі трэнеры, але я не захацеў. А праз дватры гады пачалося трохбор'е, дадалася стральба. Калі пачаў трэніравацца са старэйшымі, у мяне не вельмі добра атрымлівалася, бо тут зусім іншае саперніцтва, па-іншаму трэба размяркоўваць сілы. Калі раней быў першы, дык цяпер не трапляў нават у дваццатку. Псіхалагічна ў гэты момант было вельмі складана. Мы з трэнерамі спрабавалі змяняць тэхніку стральбы, і паступова я пачаў паказваць даволі добрыя вынікі і ў трохбор'і. Пазней трэба было пераходзіць у спартыўную школу, і ў мяне з першым трэнерам не атрымлівалася сумяшчаць заняткі, таму адправілі да Агніі Валянцінаўны Івановай, цяперашняга настаўніка, якую я вельмі паважаю і люблю. Спачатку мы прывыкалі адно да аднаго, было няпроста: новая група, новыя эмоцыі, я саромеўся і баяўся ў новым калектыве. Але паступова мы знайшлі агульную мову. Вынік у Агніі Валянцінаўны пачаў расці вельмі хутка, я скінуў хвіліну ў бегу і 13 секунд у плаванні. Гэта вельмі шмат за год работы.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

*Заданне на лета*

# ЯК НАТХНЯЦЦА І НІЧОГА НЕ БАЯЦЦА

## «Першыя» раяць, што для гэтага варта пачытаць

**19 верасня ў сталіцы адбудзецца інтэлектуальная канферэнцыя TEDxYouth@Minsk. Яе спікерамі стануць фіналісты праекта «Першыя», які праводзіцца кампаніяй A1 пры падтрымцы арганізатараў канферэнцый TEDxMinsk і Міністэрства адукацыі. Рыхтуючыся да такой адказнай падзеі, фіналісты разам з ментарамі склалі топ-10 кніг на лета і раяць яго ўсім падлеткам, якім хацелася б натхніцца на добрыя справы і дзейнічаць без страху. Вось што атрымалася:**

**1. «Выступленне ў стылі TED. Кажу. Слухаю. Чую» Джуліяна Трэжэра.** Правілы і практыкаванні ад знакамітага эксперта па гуку дапамогуць зрабіць свой голас эфектыўным інструментам уздзеяння, навучыцца фармуляваць тэмы для публічных прамоў і працаваць над уласным стылем іх падачы.

**2. «Эмацыянальны інтэлект. Чаму ён можа значыць болей за IQ» Дэніэла Гоўлмана** — дапаможнік па кантролі над сваімі пачуццямі і адчуваннямі ад знакамітага амерыканскага псіхолага. Кніга зацікавіць кожнага, хто хоча разабрацца, як канкрэтныя эмоцыі адбіваюцца на рэальных дзеяннях і ці рэальна кіраваць сабой у моманты дэпрэсіі, гневу ці смутку.




**3. «Важныя гады. Чаму не варта адкладваць жыццё на потым» Мэг Джэй** — кніжная падказка для моладзі, як вызначыцца з выбарам свайго шляху. Тут можна знайсці шмат карысных парад, як маральна падрыхтавацца да дарослага жыцця і не баяцца рабіць памылкі.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

*І адпачыць, і зарабіць*

# «ЮНАЦТВА», ЗАГАРТАВАНАЕ МАРСКІМ КЛІМАТАМ

**Летась студэнцкі выязны атрад Віцебскай вобласці «Юнацтва» імя Героя Савецкага Саюза Т. С. Марыненкі перамог у сваёй намінацыі падчас традыцыйнага Усебеларускага з'езда студэнцкіх атрадаў «Маладосць. Праца. Рамантыка». Лепш за ўсё свой атрад ведаюць яго камандзір і камісар — Аліна АЎТАНЕНКА і Вікторыя СЫСОЙ. Мы пагутарылі з дзяўчатамі аб атрыманым вопыце.**


*Аліна Аўтаненка (першая злева) і Вікторыя Сысой (першая справа).*

Чацвёртакурсніца Аліна вучыцца ў Полацкім дзяржаўным універсітэце па спецыяльнасці «Прамысловае грамадзянскае будаўніцтва». Аб студатрадаўскім руху наша гераіня даведалася яшчэ на першым курсе, калі актыўна ўключылася ў жыццё ВНУ. Тады і вызначылася, які кірунак ёй больш даспадобы.

— Пасля другога курса навучання я ўпершыню паехала працаваць ва ўсерасійскі дзіцячы цэнтр «Арляня», спадабалася амаль усё, — прыгадвае Аліна. — Таму летась не сумнявалася, што прадоўжу гэтую дзейнасць. Мы з іншымі дзяўчатамі, якія ўжо ездзілі ў Расію, сфарміравалі каманду са студэнтаў розных курсаў нашага ўніверсітэта. Мне прапанавалі стаць камандзірам, я з задавальненнем пагадзілася. Па папярэднім вопыце ведалі, што едзем туды ў якасці сэрвіснага атрада, інакш кажучы, апынёмся на кухні ці на пляжы. Калі ў першы год я была адказная за чысціню на пляжы, то на другім паспрабавала сябе ў якасці афіцыянткі і мыйшчыцы посуду ў сталовай.

Адпачывалі байцы па-рознаму. Хадзілі на дыскатэкі, у кавярні, прагульваліся па набярэжнай, ездзілі ў суседнія курортныя гарады. «Садзіліся ў аўтобус і ўвесь дзень даследавалі новыя месцы. Так пабывалі ў Сочы, Краснадары, Туапсэ, Геленджыку. Больш за ўсё ўразілі паходы ў горы. Але ўсё ж такі я імкнулася засяродзіцца на сваіх абавязках і падтрымаць тых, каму было складана знаходзіцца ўдалечыні ад дома. Мне падчас працоўнага семестра цяжка не было, бо я з дзяцінства звыклая да фізічнай працы», — падзялілася суразмоўніца.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
18 06 2020 г.

*Медыяджунглі*




# ШТО АГУЛЬНАГА Ў ЧАЛАВЕКА З БАНАНАМ

## Зомбі-фэйк — страшылка ці сродак маніпуляцыі?

**Ці ведаеце вы, для каго, у першую чаргу, быў створаны інтэрнэт? Варыянты адказаў: для навукоўцаў, прэзідэнта, настаўнікаў або ваенных? Дзе ў Кембрыджскім універсітэце была ўстаноўлена першая ў гісторыі вэб-камера? На камп'ютары, кававарцы, тэлефоне або халадзільніку? А што такое зомбі-фэйк? Калі адказаў у вас няма, то самы час пашукаць іх у сеціве.**

Стваральнікі інтэрактыўнага квіз-кахута «МедыяМІХ», **шасцікласніцы сярэдняй школы № 1 з Пастаў Маргарыта ЯНУШ, Аляксандра КАЗЛОВА і Вікторыя ЗЕЛЯНКЕВІЧ** шмат часу правялі над прыдумваннем для яго цікавых і нестандартных пытанняў, шукалі першакрыніцы. І даведаліся, напрыклад, што ДНК чалавека на 41 працэнт паўтарае ДНК банана. І гэта не фэйк, а факт. Іх сумесная работа перамагла на конкурсе для падлеткаў «Лафі фэйк» у намінацыі «Інтэрактыўныя медыя». Дзяўчаты кажуць, што праект быў створаны, каб звярнуць увагу равеснікаў на тое, як важна быць медыяадукаваным. Інтэрактыўная гульня складаецца з 27 пытанняў па розных аспектах медыяадукацыі, якія заахвочваюць не толькі дзяцей, а і дарослых паглыбіцца ў тэму. Да яе ёсць праграма з адказамі і дапоўненай інфармацыяй па кожным пытанні. А дапамагала дзяўчатам у рабоце над праектам іх настаўніца англійскай мовы Іна Віталеўна Плешавеня.

Медыяадукацыйных «Оскараў» уручалі ўжо другі раз, але сёлета цырымонія праходзіла нестандартна.

— Хто б мог падумаць, што медыяінфармацыйныя кампетэнцыі спатрэбяцца нам так хутка? З-за пандэміі падвядзенне вынікаў і фестываль медыяадукацыі нам прыйшлося праводзіць у анлайн-фармаце на платформе ZOOM, — зазначыла **намеснік старшыні Таварыства беларускай школы Тамара МАЦКЕВІЧ.** — Да таго ж усе пераканаліся ў тым, наколькі актуальныя медыйныя веды, бо пандэмія каранавіруса спарадзіла інфадэмію, якую мы не можам спыніць. Ніхто не думаў, што падзеі будуць развівацца так імкліва. У пачатку года ўсе абмяркоўвалі вынікі даследавання PISA, якое паказала, што ў свеце толькі адзін з дзесяці вучняў можа адрозніць факт ад выдумкі. А ў Беларусі толькі чатыры працэнты 15-гадовых падлеткаў, што ўдзельнічалі ў даследаванні, паказалі сваю здольнасць да крытычнага асэнсавання інфармацыі. І пакуль мы думалі, што з гэтым рабіць, інфадэмія, якая ахапіла ўсе СМІ, дала зразумець, што думаць, насамрэч, няма калі — трэба дзейнічаць.

Конкурс «Лафі фэйк» дазволіў у пэўнай ступені паказаць вынікі эфектыўнасці медыяадукацыйнай практыкі ў нашых школах і парадавацца за вучняў. Фактычна падлеткі памяняліся сёння месцамі з дарослымі: на іх ляжыць задача — навучыць сваіх бацькоў і нават педагогаў медыйным навыкам, крытычнаму мысленню, уменню адрозніваць праўду ад няпраўды, факты ад выдумак, пазнаёміць з метадамі маніпуляцыі і дэкадавання навін. І ў іх гэта выдатна атрымліваецца...

Творчасць падлеткаў ніхто не абмяжоўваў: конкурснай работай маглі быць мультымедыя (аўдыя ці відэа, кліп, міні-фільм, анімацыя, навучальны відэаролік, падкаст), графічныя і інтэрактыўныя медыя (інфаграфіка, фотарэпартаж, плакат, комікс, гульня, квіз, суполка або старонка ў сацыяльнай сетцы) ці тэкставыя медыя (лонгрыд, блог, пост, артыкул у школьнай прэсе, журналісцкае расследаванне, рэпартаж і іншыя).

І вызначыць пераможцаў аказалася вельмі няпроста. Напрыклад, у намінацыі «Інтэрактыўныя медыя» акрамя дзяўчат з Пастаў быў яшчэ адзін пераможца, які набраў такую ж колькасць балаў, — гульня для падлеткаў «Media Literacy Marathon». Яе аўтары — **дзевяцікласнікі Філіп ГРЫЦУК, Даша ЖУРАЎЛЁВА і Паліна ЛАЗАРАВА з бабруйскай гімназіі № 1.** Сябры кажуць: «Жыццё змяняецца, тэхналогіі змяняюцца, мы змяняемся, але адно застаецца ранейшым: мы і інтэрнэт, мы і сацыяльныя сеткі. У апошніх мы маем зносіны, працуем, вучымся... Але часта даводзіцца сутыкацца з недакладнай, часам адкрыта лжывай і нават хамскай інфармацыяй. Як засцерагчы сябе ў сетках? Як дапамагчы іншым? Спрабуючы адказаць на гэтыя пытанні, мы і запусцілі праект «Media Literacy Marathon».

У намінацыі «Графічныя медыя» перамогу святкавалі **васьмікласніцы з сярэдняй школы № 2 Століна Настасся БРУЦКАЯ і Кацярына САВІЦКАЯ,** якія стварылі цэлы комікс «Дай пяцёрачку». Як адзначыў **член журы, прафесар кафедры педагогікі і менеджменту адукацыі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі Мікалай ЗАПРУДСКІ,** графічныя медыя — не самая простая намінацыя. Там патрабуецца не проста ідэя і яе медыйнае напаўненне, але яшчэ і мастацкія кампетэнцыі, уменне выстройваць кампазіцыю, падбіраць удалыя колеравыя рашэнні. І дадаў: «Але, зразумела, нельга пераможцы ў конкурсе, не беручы ў ім удзелу!»

У «Тэкставых медыя» найлепшай стала работа, прысвечаная інтэрпрэтацыі аповесці Уладзіміра Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха» сродкамі кінамастацтва. Яе аўтар — **Ганна ЗЯМЛЯНІК, цяпер ужо выпускніца тураўскай сярэдняй школы № 2** кажа: «Апошнім часам мае равеснікі часта замяняюць чытанне кніг праглядам кінафільмаў. Кіно, мультфільмы, серыялы складаюць значную частку медыяспажывання сучаснага школьніка. Я імкнулася даказаць, што прагляд фільма не можа замяніць тэкст-першаасnову, таму да экранізацыі трэба ставіцца крытычна і разглядаць яе ў якасці дапаўнення да кнігі, а не ў якасці раўназначнай замены. Прапаную правесці параўнальны аналіз аповесці Уладзіміра Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха» і аднайменнай кінастужкі Валерыя Рубінчыка ды вызначыць супадзенні і несупадзенні ў інтэрпрэтацыі тэмы, ідэі, сістэмы вобразаў, жанравай спецыфікі аповесці і кінастужкі».

А сапраўднымі трыумфатарамі медыяконкурсу «Лаві фэйк» сталі **выпускніцы бабруйскай гімназіі № 1 Аляксандра ЖАРКЕВІЧ і Дар'я ЮШЧАНКА.** Так, у намінацыі «Мультымедыя» ўсіх членаў журы скарыла іх відэа «Праўдзівае слова, альбо "Як не трапіць у пастку фэйкаў"». Па словах дзяўчат, гэта была спроба вырашыць такую праблему, як маніпуляцыя людзьмі ў СМІ і інтэрнэце праз стварэнне, выкарыстанне і распаўсюджванне фэйкавых навін. Другая работа, створаная бабруйскімі адзінаццацікласніцамі, была заяўлена ў «Тэкставых медыя» — гэта старонка, прысвечаная фэйкам і фактчэкінгу. Яна аказалася настолькі грунтоўнай, настолькі добра структураванай і рознабаковай, што міма не змаглі прайсці не толькі члены журы, але і ўсе, хто цікавіўся конкурсам. Таму прыз глядацкіх сімпатый за гэту работу — цалкам лагічны і справядлівы вынік.

# ЯК НАТХНЯЦЦА І НІЧОГА НЕ БАЯЦЦА

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

4. **«Разам. Як знайсці аднадумцаў, згуртаваць людзей і адчуць сувязь з усім светам» Рады Агравал** — натхняльнае даследаванне, як сярод мільёнаў людзей знайсці менавіта «сваіх». Пабуджае прааналізаваць сваё кола стасункаў і быць побач з тымі, хто сапраўды здольны змяніць тваё жыццё.

5. **«Аб чым марыць. Як зразумець, чаго ты хочаш на самай справе, і як гэтага дамагчыся» Барбары Шэр** — карысныя парады па пошуку матывацыі. Кніга дапамагае пазбавіцца негатыўных думак, перастаць чакаць увесь час нібыта ўдалага моманту і пачаць дзейнічаць з любоўю да сябе.

6. **«Геніі і аўтсайдары. Чаму адным усё, а іншым нічога?» Малькальма Гладуэла** — пераканаўчыя доказы таго, што любы поспех зусім не выпадковасць, а заканамернасць. Яны будуць карысныя для ўсіх, каму хоць раз здавалася, што жыццё да яго несправядлівае.

7. **«Урокі імправізацыі. Як перастаць планаваць і пачаць жыць» Патрысіі Мэдсан** — правілы вопытнага выкладчыка акцёрскага майстэрства і парады прымаць з радасцю любыя нечаканасці. Кніга прываблівае тым, што замест пафасу накшталт «цаніце кожны момант і пражывайце кожную хвіліну» там можна знайсці канкрэтныя прыклады і падказкі, якія дапамогуць заўжды так рабіць.

8. **«TED Talks. Словы змяняюць свет. Першы афіцыйны дапаможнік па публічных выступленнях» Крыса Андэрсана** — дзейсныя парады ад ідэолага і куратара TED, як зрабіць сваю публічную прамову незабыўнай падзеяй для іншых людзей. Аўтар ведае гэта з уражальнага ўласнага вопыту, таму варта да яго прыслухацца.

9. **«7 навыкаў высокаэфектыўных людзей» Стывена Р. Кові** — кніга, якая прапануе сістэмны падыход і дапамагае вызначыцца з мэтамі па жыцці. Па версіі аўтарытэтнага сусветнага часопіса TIME лічыцца адной з 25 найбольш уплывовых кніг па бізнесе, якой зачытваліся Біл Клінтан, Лары Кінг і Стывен Форбс.

10. **«Радзіва «Прудок». Дзённік» Андруся Горвата** — зборнік нататак для Facebook, напісаных журналістам, тэатральным дворнікам, гаспадаром палескай хаты, пісьменнікам і проста чалавекам, які шукае сваё месца ў гэтым свеце. Шчырыя прызнанні і гумарыстычныя назіранні аўтара адгукнуцца ў кожным і падштурхнуць на шлях да самога сябе.

Апошнія тры кнігі з гэтай літаратурнай падборкі кожны з фіналістаў атрымаў у падарунак ад арганізатараў конкурсу «Першыя». Некаторыя нават ужо гатовыя падзяліцца ўражаннямі пра іх і сваімі планамі, што яшчэ хацелі б прачытаць падчас канікул.

**Настасся КУНДЗІР (Віцебск, сярэдняя школа № 12):**



— Пачаць лета я планавала з кнігі Джэрэмі Донавана «Выступленне ў стылі TED» і ўжо так і зрабіла. Таксама чытаю «TED Talks». Вельмі цікава і карысна! Дапамагае ўбачыць нейкія нязначныя нюансы ў любым тэксце, пра якія вам ніхто не раскажа. Разумееш, як трэба рухацца, паводзіць сябе, як захапіць тых, хто цябе слухае. Увогуле кніга дапамагае перамагчы страх публічнага выступлення і адчуць сябе «зоркай» на сцэне. Таксама мне вельмі спадабалася «Радзіва «Прудок» — цікава чытаць думкі чалавека, які не баіцца расказваць пра свае памылкі ў жыцці, можа пасмяяцца з сябе. Але маёй любімай кнігай застаецца «Адзінокі васьмікласнік хоча пазнаёміцца» Алеся Бадака — пісьменнік расказвае пра сваё дзяцінства, вучобу, закаханасць у маладую настаўніцу. Гэты твор пабуджае мяне пісаць, працаваць, фантазіраваць і рабіць многае іншае. Часта яго перачытваю. Думаю, ён зацікавіць любога школьніка.

**Ангеліна СЕБІК (Гомель, гімназія № 10):**



— Калі мне неабходны матывацыя і спакой, перачытваю «Жыццё Дэвіда Коперфілда» Чарльза Дзікенса. А ўвогуле спіс кніг, якія мне яшчэ хацелася б прачытаць, вялікі. І новыя назвы трапляюць туды хутчэй, чым я паспяваю выкрэсліваць старыя. Апошнім часам збольшага дадаю ў яго імёны з беларускай літаратуры розных часоў. Мне вельмі даспадобы стыль Кузьмы Чорнага, таму летнія канікулы планую пачаць акурат з яго твораў.

**Кацярына ЯНГОЛЬ (Крэўскі яслі-сад — сярэдняя школа, Смаргонскі раён):**



Фота Сяргея ГАПОНА.

— Для падрыхтоўкі да канферэнцыі ў першую чаргу пачала чытаць «TED Talks», бо выступаць перад людзьмі і даносіць свае думкі так, каб цябе слухалі — гэта навык, які неабходна развіваць. А паколькі цяпер і я далучылася да сусветнага руху TED, то хачу зрабіць сваё выступленне запамінальным і цікавым. Мяркую, «7 навыкаў высокаэфектыўных людзей» таксама дапамогуць мне ў гэтым. Зараз чытаю «Радзіва «Прудок» і атрымліваю асалоду ад гэтай касмічнай кнігі і прыгожай беларускай мовы, якой яна напісана.

**Паласу падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота з архіваў герояў.**

*З «базай» у галаве*

# «ПАДКАВАНЫЯ» Ў ТЭАРЭТЫЧНАЙ МЕХАНІЦЫ

## Курсанты МНС — у ліку яе знаўцаў

**Прадстаўнікі Універсітэта грамадзянскай абароны МНС Мікіта ЛЯШЭНКА і Антон БАРЦОЎ упершыню ў гісторыі сталі прызёрамі прэстыжнай Міжнароднай алімпіяды па тэарэтычнай механіцы. Будучыя ратавальнікі заваявалі адразу два прызавыя месцы.**



За званне найлепшага знаўцы па тэарэтычнай механіцы змагаліся 294 удзельнікі з 50 ВНУ, якія прадстаўлялі Азербайджан, Арменію, Беларусь, Кітай, Расію, Туркменістан, Узбекістан і Украіну.

Змяненне формы правядзення турніру наклала адбітак на яго праграму. Калі раней праводзіліся асабіста-камандны тэарэтычны конкурс і камандны конкурс рашэння кароткіх задач (брэйн-рынг), то сёлета было прынята рашэнне аб правядзенні толькі тэарэтычнага конкурсу, вынікі якога падводзіліся толькі ў асабістым заліку.

Удзельнікі на працягу дзвюх з паловай гадзін змагаліся ва ўменні прымяняць веды, атрыманыя пры вывучэнні такіх дысцыплін, як тэарэтычная механіка, фізіка, матэматыка, а таксама дэманстравалі здольнасці да сістэмнага аналізу і дзеяння, навыкі самастойнай работы і творчае мысленне.

Студэнтам трэба было рашыць шэсць задач (па дзве па статыцы, кінематыцы і дынаміцы). Прычым канкурсанты мусілі выканаць не толькі відавочныя дзеянні, але і такія, пра якія часам цяжка здагадацца, а таксама падрабязна і аргументавана апісаць ход рашэння і прывесці ўсё схематычна.

Па выніку курсанты факультэтаў тэхнасфернай бяспекі і папярэджання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый Універсітэта грамадзянскай абароны МНС Мікіта Ляшэнка і Антон Барцоў сталі прызёрамі міжнароднай алімпіяды, заваяваўшы II і III месцы адпаведна. Падрыхтавалі будучых ратавальнікаў Андрэй Камлюк і Тарас Мартыненка.

Варта адзначыць, што Мікіта Ляшэнка таксама прызнаны найлепшым у Беларусі знаўцам па тэарэтычнай механіцы. Ад аргкамітэта ён удастоены дыплома I ступені.

Пераможцам жа інтэлектуальнага форуму стаў студэнт Універсітэта Цінхуа (Кітай) Лю Цзэхуа.

Міжнародная алімпіяда па тэарэтычнай механіцы ў анлайн-фармаце праведзена ўпершыню. Традыцыйна яе арганізатарам выступіў Беларускі дзяржаўны універсітэт транспарту.

**Інфармацыя і фота МНС.**

*Даніна памяці*

# Прыгадваючы падзеі таго страшнага часу...

**Моладзь Беларусі і Расіі праводзіць анлайн-вэбінары па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.**

Беларуска-расійскі «Марафон Памяці» — гэта праект Міжнароднай школы маладых лідараў двух краін. У яго рамках пройдзе серыя анлайн-вэбінараў у сацыяльнай сетцы Instagram з гісторыкамі, грамадскімі дзеячамі і ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны з розных рэгіёнаў Беларусі, Расіі і краін СНД.

«Беларуска-расійскі анлайн-«Марафон Памяці» мы вырашылі арганізаваць напярэдадні 22 чэрвеня. Менавіта ў гэты дзень 79 гадоў таму пачалася Вялікая Айчынная вайна. Галоўная мэта — гэта стасункі і абмен думкамі. Нашы спікеры кажуць пра тое, як праходзіла вайна на іх тэрыторыі, пра лёс сваякоў, канкрэтных жыхароў горада ці пасёлка», — расказаў **першы сакратар Віцебскага абласнога камітэта БРСМ Вячаслаў ХРОЛ.**

Падвядзенне вынікаў марафону адбудзецца 22 чэрвеня ў рамках круглага стала, прысвечанага 79-й гадавіне пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Круглы стол пройдзе ў фармаце відэаканферэнцыі і збярэ каля 100 прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый, дзіцячых рухаў, гістарычных клубаў, адукацыйных устаноў Беларусі, Расіі і краін СНД.

Арганізатарамі марафону выступаюць Віцебская абласная арганізацыя БРСМ і Смаленская абласная грамадская арганізацыя «Расійскі саюз моладзі».

**Даведка**

Міжнародная школа маладых лідараў — гэта пляцоўка, якая аб'ядноўвае лідараў Расіі, Беларусі і краін СНД з мэтай абмеркавання, распрацоўкі і рэалізацыі сумесных сацыяльна-значных праектаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*На слыху*

# Ці заўсёды школа — бяспечнае месца?

**У новым навучальным годзе ў шэрагу школ краіны ў рамках эксперыментальнай дзейнасці будзе ўкаранёная беларуская мадэль «Дружалюбнае адукацыйнае асяроддзе ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі», скіраваная на прадухіленне булінгу, псіхічнага і фізічнага гвалту сярод навучэнцаў.**

Беларуская мадэль з'яўляецца вынікам навукова-даследчай работы па адаптацыі харвацкай мадэлі «Бяспечнае і падтрымліваючае асяроддзе ў школах», якую правеў Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка ў партнёрстве з ЮНІСЕФ і пры фінансавай падтрымцы фонду «Польская дапамога» пры Міністэрстве замежных спраў Рэспублікі Польшча.

Укараненне мадэлі складаецца з сямі крокаў і паспрыяе фарміраванню ў вучняў школ узаемнай павагі, уключэнню ў працэс прафілактыкі гвалту бацькоў, настаўнікаў і прадстаўнікоў мясцовых органаў улады.

Праект будзе рэалізоўвацца пры ўдзеле ментара — пазаштатнага ўдзельніка адукацыйнага працэсу. Такая пазіцыя мае перавагі, якія заключаюцца ў даверальным узаемадзеянні з работнікамі, дзецьмі і бацькамі, паколькі ментар непасрэдна не ўключаны ў сістэму субардынацыі і прафесійных адносін унутры школы і мае магчымасць захоўваць свежы погляд на звыклыя для калектыву з'явы.

Канчатковым вынікам рэалізацыі мадэлі з'яўляецца стварэнне ўмоў трансфармацыі ўстаноў адукацыі ў псіхалагічна бяспечнае месца. У будучыні школы, якія паспяхова рэалізавалі ўсе крокі праграмы, змогуць атрымаць статус «дружалюбнай школы/гімназіі/ліцэя/каледжа».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**



*Класныя навіны*

# На матэматыку — 10 чалавек на месца

**У Ліцэі Белдзяржуніверсітэта падвялі вынікі прыёмнай кампаніі. Агульны конкурс у навучальную ўстанову склаў 6,6 чалавека на месца. Усяго сёлета было пададзена 1739 заяў. Найбольшая колькасць дакументаў прынята ў біялагічныя класы — 286. Конкурс тут склаў 6,5 чалавека на месца.**

У матэматычны клас зарэгістраваліся 217 абітурыентаў (конкурс — 9,9 чалавека на месца), фізічны — 208 (конкурс — 9,5), гуманітарны — 198 (конкурс — 9), інфарматыка-матэматычны — 165 (конкурс — 7,5), хімічны — 119 (конкурс — 5,4), гісторыка-грамадазнаўчы — 90 (конкурс — 4,1), філалагічны — 69 (конкурс — 3,1).

Сёлета ўпершыню праводзіўся набор па трох новых профілях навучання: эканамічным, інфарматыка-фізічным і лінгвістычным. Першы арыентаваны на вывучэнне матэматыкі і англійскай мовы, другі — на фізіку і інфарматыку, трэці — на гісторыю Беларусі і англійскую мову. У гэтыя класы конкурс склаў адпаведна 8,7, 4,9 і 3,9 чалавека на месца.

Залічэнне ў ліцэйскія класы ажыццяўлялася па выніках двух пісьмовых уступных выпрабаванняў. Пры паступленні на гуманітарны профіль у гэтым годзе неабходна было набраць 151 бал, біялагічны — 138, гісторыка-грамадазнаўчы — 120, філалагічны — 105, эканамічны — 105, лінгвістычны — 92, матэматычны — 87, хімічны — 84, інфарматыка-матэматычны — 75, інфарматыка-фізічны — 69, фізічны — 61.

Усяго ў Ліцэй БДУ ў 10-я класы былі прынятыя 264 навучэнцы, з іх сфарміраваныя 12 класаў па 22 чалавекі. Сярод будучых ліцэістаў 73 працэнты складаюць жыхары сталіцы і 27 працэнтаў — прадстаўнікі з усіх абласцей Беларусі.

Адметнасцю цяперашняй уступнай кампаніі стала пашырэнне функцыяналу «Асабістага кабінета абітурыента». Вынікі экзаменаў можна было даведацца ў Ліцэі, а таксама праз згаданы электронны рэсурс, дзе былі размешчаны адсканаваныя адказы абітурыентаў і ключы да заданняў.

Трэба таксама дадаць, што сёлета ўсе абітурыенты паступалі на агульных падставах у сувязі з адменай заключнага тура рэспубліканскай алімпіяды для ўсіх навучэнцаў, акрамя адзінаццацікласнікаў. Але пры паўпрахадным бале прыярытэт аддаваўся лаўрэатам абласнога або мінскага гарадскога этапу рэспубліканскай алімпіяды.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*З нагоды*

# 65-Ы СЕЗОН ЯЕ МАЛАДОСЦІ

## У «Малой Беларускай» — юбілей

**9 ліпеня Дзіцячай чыгунцы імя К. Заслонава споўніцца 65 гадоў. У гэты дзень у 1955 годзе па «Малой Беларускай» — менавіта так часта называюць Дзіцячую чыгунку — у свой першы рэйс адправіўся паравоз з вагонамі, пасажырамі якога сталі школьнікі і ганаровыя госці.**

Цяпер на Дзіцячай чыгунцы завяршаецца комплекс работ па падрыхтоўцы да святкавання 65-годдзя, у выніку якіх зменіцца знешні выгляд вакзала на станцыі Заслонава, а ў зале чакання з'явіцца шмат тэхнічных навінак, якія будуць цікавыя юным пасажырам і іх бацькам, інфармуе прэс-цэнтр магістралі.

Урачыстае адкрыццё 65-га юбілейнага сезона на Дзіцячай чыгунцы плануецца напярэдадні Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

Дзіцячая чыгунка імя К. Заслонава ўяўляе сабой унікальны адукацыйны комплекс, які спалучае ў сабе функцыі сапраўднага чыгуначнага прадпрыемства і ўстановы прафесійнай падрыхтоўкі і дадатковай адукацыі дзяцей.

З восені да вясны ў вучэбным цэнтры Дзіцячай чыгункі больш за 400 навучэнцаў сярэдніх школ Мінска і Мінскай вобласці бясплатна праходзяць тэарэтычнае навучанне розным чыгуначным прафесіям, вывучаюць устройства лакаматываў, вагонаў, пуцявой гаспадаркі, асновы арганізацыі руху цягнікоў, сігналізацыі і сувязі. Кожны год хлопцы і дзяўчаты з нецярпеннем чакаюць гадавой цягніковай практыкі, каб замацаваць свае веды ў рэальных умовах, зрабіць яшчэ адзін крок на шляху да мары.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
18 06 2020 г.

*Крок да прафесіі*

# «Кузня» будучых журналісцкіх кадраў

## У гэтай якасці выступае гурток з «Маладзіка»

**Сёлета ў Маладзечанскага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі «Маладзік» — юбілей, ён адзначае сваё 25-годдзе. А гуртку юных журналістаў, які працуе пры ім, спаўняецца 20 гадоў. Увесь гэты час «Школай журналістыкі» кіруе Наталля Віктараўна Шульжыцкая. «Гэта маё дзецішча, — кажа яна. — Хлопцы і дзяўчаты творчыя, захопленыя любімай справай, заўсёды прымаюць актыўны ўдзел у розных конкурсах і фестывалях і не толькі. Так, у нас ёсць сумесны праект з «Маладзечанскай газетай» — старонка «Маладзёжнае перакрыжаванне». Выпускаем сваё выданне «Маладзік», якое сёлета змяняе фармат з папяровага на інтэрнэтаўскае».**

...У «Школу журналістыкі» **16-гадовая Ірына СЛІЖЭЎСКАЯ** трапіла больш за два гады таму. На той момант дзяўчына ўжо пісала апавяданні і вершы, але не ведала, што ў родным горадзе ёсць месца, дзе можна займацца пісьменніцтвам больш грунтоўна. Цяпер яна захапляецца рэпартажамі: ёй падабаецца асвятляць падзеі, пад уражаннем рыхтаваць матэрыял. З цяжкасцямі спраўляцца дапамагае Наталля Віктараўна. Напрыклад, раней складаным заданнем для Ірыны было браць інтэрв'ю ў кагосьці, бо нават пачуццё гатоўнасці не дапамагала справіцца з хваляваннем.

У дзяўчыны ўжо ёсць 15 публікацый у розных газетах і часопісах, а таксама на некаторых інтэрнэт-парталах. Яна ўдзельнічала ў раённым этапе конкурсу «Залатое пяро Белай Русі»: у мінулым годзе заняла другое месца, а сёлета стала пераможцам. Адпраўляла работы на «Старт» у БДУ, «Зменім свет да лепшага», «Дарогамі Кацюшы». У творчым спаборніцтве «Ты ў эфіры» заняла першае месца сярод удзельнікаў раённага этапу. Атрымала дыплом першай ступені ў міжнародным фотаконкурсе «Мы не забудзем».

— Люблю выказваць свае эмоцыі і думкі. Нехта робіць гэта праз пэндзаль і палатно, спевы, а я — праз напісанне артыкулаў, у якія ўкладаю свае пачуцці, перажыванні, думкі. І гэта менавіта тое, што мяне прыцягвае ў гэтай сферы, — дзеліцца суразмоўніца.

**Яне АКІМАВАЙ — 15,** і ў дзяўчыны таксама сур'ёзныя планы адносна будучай прафесіі.

— Як трапіла сюды? Памятаю, спытала ў маці, што трэба рабіць, каб пайсці вучыцца на журналіста. Мы зайшлі на сайт БДУ і даведаліся: патрэбны публікацыі. Маці са словамі «я недзе бачыла...» вынесла газету, адзін з матэрыялаў якой быў падпісаны аўтарам са згаданнем гуртка з «Маладзіка». Так, уласна, усё і закруцілася.

Дзяўчына піша на розныя тэмы, аднак асаблівую ўвагу аддае пытанням экалогіі, самаразвіцця, навучання, палітыцы і творчым дасягненням. Юная журналістка расказвае, што гурток — гэта добрая магчымасць атрымаць у тым ліку і канструктыўную крытыку. Недахопы ў работах аўтары разбіраюць разам з настаўнікам, каб больш іх не дапускаць.

Яна таксама мае пэўныя творчыя дасягненні: дзяўчына стала



Фота дадзена «Школай журналістыкі».

Наталля Шульжыцкая *(у цэнтры)* з гуртакоўцамі Настассяй Шумілавай, Янай Акімавай, Кацярынай Квачонак, Алінай Шумель і Ірынай Сліжэўскай.

пераможцам-прызёрам творчага конкурсу «Пераходнага возраста» і заняла трэцяе месца на абласным этапе творчага спаборніцтва «АрхНавацыя-2019».

— Я пішу, бо хачу, каб мяне пачулі. І спадзяюся на зваротную сувязь. Таму што мне важна ведаць пра памылкі, выпраўляць іх, каб з кожным разам зацікаўліваць чытачоў усё больш і больш, — гаворыць дзяўчына.

У «багажы» ў Яны — вершы, песні, апавяданні, а цяпер суразмоўніца працуе над іншым сур'ёзным творчым праектам — кнігай.

**17-гадовая Кацярына АКУШКА** запісалася ў «Школу журналістыкі» ў пачатку 11 класа, каб лепш падрыхтавацца сябе да паступлення ў ВНУ.

— Любімы мой жанр — інтэрв'ю. Мне падабаецца кантактаваць з чалавекам асабіста, прыдумляць і задаваць пытанні не толькі ад сябе, але і для сябе, — гаворыць Каця. — Героі матэрыялаў самыя розныя: валанцёры, спартсмены, вядомыя ў горадзе людзі, але найперш — моладзь.

Гурток не перастае папаўняцца новымі ўдзельнікамі. Вось і **16-гадовая Ксенія НЕСЦЯРОВІЧ,** якая нядаўна прыйшла ў яго займацца, хоча стаць журналістам.

— З восьмага класа я марыла аб гэтай прафесіі, таму ўзрадавалася, калі даведалася пра гурток. Хаджу сюды нядаўна, любімых тэм яшчэ не знайшла. Зараз працую над сабой і сваім стылем: змагаюся з таўталогіяй, маўленчымі і граматычнымі хібамі, — расказала пра сябе Ксенія.

— «Школа журналістыкі» — гэта своеасаблівы «чароўны ключык», які дапамагае падлеткам адкрыць дзверы ў свет будучай прафесіі. За 20 гадоў сваё жыццё з ёй звязалі 37 «выпускнікоў» гуртка. Павел Капуцкі — карэспандэнт праграмы «Дзень спорту» на «Беларусь 1». У Белтэлерадыёкампаніі працуюць Наталля Кезік, Кацярына Шыбко, Лізавета Лакотка, Вікторыя Дубаневіч. Юлія Стрыга — на «СТБ». Самая першая выпускніца, Настасся Нарэйка, з'яўляецца адказным рэдактарам газеты «Навіны Камянеччыны», яна член Саюза пісьменнікаў Беларусі, падарыла мне свой першы выдадзены зборнік вершаў «Магдэбургскае права маёй душы». Прыемна ўсведамляць, што з неаперыных птушанят вырастаюць прафесіяналы сваёй справы, і ты маеш да гэтага дачыненне, — падвяла своеасаблівы вынік Наталля Віктараўна.

***АД РЭДАКЦЫІ.** Многія гуртакоўцы ў розныя гады прымалі ўдзел у творчым конкурсе для юных і маладых нештатных аўтараў, які ладзіла «Чырвонка. Чырвоная змена». І станавіліся яго пераможцамі або лаўрэатамі, а потым паспяхова паступалі на журфак. У Маладзечна працуе сапраўды даволі моцная школа для пачаткоўцаў, тых, хто марыць аб гэтай прафесіі. Зычым усім удзельнікам гуртка і яго кіраўніку далейшых сумесных творчых поспехаў!*

**Кацярына КАСЦЕВІЧ,**
**студэнтка IV курса**
**факультэта журналістыкі БДУ.**

# «ЮНАЦТВА», ЗАГАРТАВАНАЕ МАРСКІМ КЛІМАТАМ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

Аліна прызналася, што ў першы год знаходжання ў дзіцячым цэнтры некаторыя з іх атрада, у тым ліку і яна, паспелі папрацаваць яшчэ і ў прыбярэжнай кавярні, каб больш зарабіць на наступныя падарожжы і завесці новыя знаёмствы. Такім чынам, налета ехалі ў Расію ўжо да знаёмых і сяброў.

— Мая бабуля, дарэчы, трохі знервавалася з-за таго, што я правяла лета не з ёй на дачы, дапамагаючы па гаспадарцы, а на моры *(усміхаецца)*. Увогуле пасля атрымання такога досведу ў мяне павысілася пачуццё адказнасці за іншых. Мне і надалей хацелася б быць часткай студатрадаўскага руху, аднак цяпер я прызначана сакратаром БРСМ свайго ўніверсітэта і таму не магу гэтага зрабіць, — маю іншыя абавязкі.

Камісар «Юнацтва» Вікторыя — студэнтка чацвёртага курса спецыяльнасці «Дызайн прадметна-прасторавага асяроддзя» Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, а таксама старшыня студэнцкага савета інжынерна-будаўнічага факультэта. Далучылася да выязнога атрада два гады таму. Галоўным жаданнем дзяўчыны і матывацыяй на працоўны семестр была магчымасць убачыць мора і атрымаць прыемныя ўражанні, якімі часта дзяліліся знаёмыя, што ўжо ездзілі ў Расію ў складзе студатрада.

— На другі год паездкі ў «Арляня» мы з Алінай былі ўжо больш дасведчаныя ў гэтай справе, таму расказвалі навічкам аб усіх складанасцях і нюансах, каб яны былі да іх добра падрыхтаваныя. Летась з сярэдзіны чэрвеня да канца жніўня ў складзе 27 байцоў мы працавалі ў пасёлку Навамiхайлаўскі Краснадарскага краю. Месца невялікае, аднак там размяшчаецца вельмі прыгожая набярэжная, ёсць шмат забаў. Жылі не на тэрыторыі лагера — нам былі выдзелены інтэрнат у пасёлку. Рабочы дзень доўжыўся з сямі гадзін раніцы да пяці вечара. Было зручна: два дні «ў полі», два — адпачываеш, тым больш работа на кухні і пляжы дынамічная і цікавая. Дарэчы, мы там добра высыпаліся, напэўна, дапамагаў марскі клімат.

Суразмоўніца расказала, што сталовыя, якія абслугоўвала «Юнацтва» і іншыя студэнцкія атрады, былі разлічаны прыкладна на 700 дзяцей. Таму зразумела, што некаторыя студэнты спачатку аказаліся не вельмі гатовыя да такой нагрузкі. «Аднак пасля нават яны з'язджалі адтуль са слязьмі на вачах, — так прывыклі да калектыву і цёплай атмасферы», — прыгадала Віка.



Пакуль адны шчыравалі на кухні...



...іншыя прыбіралі пляж.

— Бацькі, дарэчы, калі даведаліся пра мае планы на лета, першапачаткова напружыліся, не хацелі адпускаць так далёка і надоўга, — дадала гераіня. — Перажывалі, хваляваліся. Аднак я была ўпэўненая ў сваім жаданні і ні разу не пашкадавала. Колькі новых знаёмстваў займела! Там вельмі рады бачыць студэнтаў з Беларусі, ім цікава, як жывуць і вучацца ў нас, нам — як у іх. Дагэтуль перапісваемся са многімі хлопцамі і дзяўчатамі, яны нас чакаюць ізноў. Сёлета я планавала паспрабаваць свае сілы ў рамках будаўнічага атрада, але з-за пандэміі невядома, як яно будзе.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота з архіва гераінь.**

*Трэці працоўны*

# СТУДАТРАДЫ АТРЫМАЮЦЬ ПУЦЁЎКІ

**Сёлета для іх удзельнікаў забраніравана каля 30 тысяч рабочых месцаў.**

Гэтым разам трэці працоўны семестр будзе прысвечаны юбілею Вялікай Перамогі. Урачыстая цырымонія адкрыцця з уручэннем працоўных пуцёвак студэнцкім атрадам з розных рэгіёнаў краіны пройдзе 28 чэрвеня, у Дзень моладзі, у Мінску. Фіналам мерапрыемства стане агульнаатрадная спеўка. Плануецца прэзентаваць новую студатрадаўскую песню, якая, магчыма, стане гімнам беларускіх студэнцкіх атрадаў.

Праграма свята складаецца з розных відаў актыўнасці. У прыватнасці, на тэрыторыі гісторыка-культурнага комплексу «Лінія Сталіна» запланаваны маладзёжная працоўная акцыя «Працуем раЗАм!», экскурсія і студатрадаўскі квэст, прысвечаны 75-годдзю Вялікай Перамогі.

29 чэрвеня плануецца заезд студэнцкіх атрадаў на Усебеларускую маладзёжную будоўлю «Горад маладосці» ў Астравец. 1 ліпеня ў сталіцы больш за 500 чалавек прыступяць да работы на аб'ектах Мінскага завода халадзільнікаў. У міжнародным вытворчым працоўным праекце «Атлант-2020» хлопцы і дзяўчаты будуць працаваць у якасці слесараў-зборшчыкаў бытавой тэхнікі. Больш за 250 чалавек плануецца задзейнічаць на абласных (Мінскай гарадской) маладзёжных будоўлях.

Прома-праект «Выбіраем студатрад!» па інфармаванні і папярэднім запісе патэнцыяльных байцоў студэнцкіх атрадаў працягваецца. Сёлета ён праходзіць анлайн у групах БРСМ у сацсетках з выкарыстаннем тэхналогіі QR-кода і хэштэгаў #Выбіраем_студотряд!, #студатрад, #Працуем_разам!, #БСА.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Не прапусці!*

# З «ТАТАЗАЛЫ» — У «#РАЗАМ З БАЦЬКАМ»

**Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі правядзе рэспубліканскі сямейны інтэрнэт-чэлендж «#раЗАм з бацькам», прымеркаваны да Дня бацькі. Ён стартаваў сёння, 18 чэрвеня, і завершыцца ў Дзень бацькі, які святкуецца ва ўсім свеце ў трэцюю нядзелю месяца (21-е чысло сёлета).**

Інтэрнэт-чэлендж — гэта перайначаны сямейны праект БРСМ «ТатаЗала». Для ўдзелу ў ім неабходна стварыць відэаролік пра тое, як таты і іх маленькія дзеці разам займаюцца фізічнай культурай. Гэта можа быць ранішняя зарадка, сілавыя практыкаванні, спартыўныя гульні — як дома, так і на свежым паветры.



Як паведамілі ў ЦК Саюза моладзі, відэаролік неабходна зняць у гарызантальным становішчы працягласцю да адной хвіліны і выкласці на асабістых старонках у сацсетках, суправадзіўшы хэштэгамі #папазал, #деньотца, #раЗАмзбацькам. Створаныя ролікі трэба размяшчаць з 18 да 21 чэрвеня і суправаджаць тэкставым каментарыем пра яго ўдзельнікаў, хэштэгамі праекта і абавязкова адзнакай @brsmb.

Інтэрнэт-чэлендж «#раЗАм з бацькам» скіраваны на захаванне традыцыйных сямейных каштоўнасцяў, умацаванне і развіццё бацькаўскадзіцячых стасункаў і папулярызацыю здаровага спосабу жыцця. Нагадаем, што 1 чэрвеня па ініцыятыве моладзі Гродзенскай вобласці стартаваў сямейны рэспубліканскі маладзёжны праект «#раЗАм з бацькамі», падчас якога бацькі і іх дзеці пры падтрымцы валанцёраў руху БРСМ «Добрае Сэрца» добраўпарадкуюць дзіцячыя пляцоўкі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
**Фота з сайта БРСМ.**

*Дарослае жыццё*

# Алімпійскім марам — збыцца!



У вучылішчы Алімпійскага рэзерву ў сталіцы ўручылі атэстаты. Мы сустрэлі выпускніц на парозе іх альма-матар і запыталіся пра іх мары. Валерыя Крук, Варвара Драгун, Дар'я Дзяшкевіч (злева направа) ужо атрымалі майстара спорту па плаванні, а Паліна Ражнова (другая злева) — кандыдат у майстры спорту па трыятлоне. Свой будучы шлях у дарослым жыцці яны ўжо выбралі — усе плануюць працягваць спартыўную адукацыю. Кожная з іх падзялілася марамі, але дзяўчаты папрасілі не пісаць пра гэта, каб усё здзейснілася. Я веру, што ўсё атрымаецца, бо мары павінны збывацца.

**Таццяна ТКАЧОВА, фота аўтара.**

*Карысны досвед*

# Дыстанцыя адукацыі не перашкода?

**Другі семестр ва ўсіх вышэйшых навучальных установах сёлета выдаўся сапраўды незвычайны: большасць універсітэтаў перайшлі на дыстанцыйнае навучанне ў сувязі з эпідэміялагічнай сітуацыяй. Студэнтам і выкладчыкам розных спецыялізацый прыйшлося працаваць з дапамогай інтэрнэт-сэрвісаў. Пра тое, які быў гэты досвед, з «Чырвонкай. Чырвонай зменай» падзяліліся прадстаўнікі БДУ, БДУІР, БДЭУ, БДМУ і БНТУ.**



## ШТО ПРА ГЭТА ДУМАЮЦЬ СТУДЭНТЫ

**Галіна МІНКАВА, студэнтка III курса ўліковаэканамічнага факультэта БДЭУ:**

— Напачатку мы працавалі па схеме: выконваем пісьмовае заданне — адпраўляем выкладчыку на электронную пошту. Калі стала відавочна, што дыстанцыйнае навучанне зацягваецца, па некаторых прадметах нам арганізавалі практычныя заняткі ў «Zoom» — праграме для відэа-канферэнцый. Такі фармат атрымання ведаў досыць зручны, аднак ёсць і недахопы: напрыклад, у нейкім выпадку немагчыма даступна растлумачыць і паказаць выкладчыку, што табе незразумела. З-за гэтага, а таксама з-за розных перашкод у рабоце інтэрнэт-сэрвісаў (няўстойлівага злучэння, перагрузы, жанасці), на маю думку, часткова згубілася якасць адукацыі... Плюсы таксама ёсць: дыстанцыйнае навучанне эканоміць час і выдаткі на дарогу. Акрамя таго, мне здаецца, такі фармат атрымання ведаў падыдзе людзям, якія ўжо маюць адукацыю і добра разбіраюцца ў сферы, якую вывучаюць. А для мяне падчас такога навучання было складана зразумець важныя для маёй будучай спецыяльнасці тэмы.

**Андрэй ДЗЯМЧУК, студэнт II курса факультэта камп'ютарных сістэм і сетак БДУІР:**

— У залежнасці ад выкладчыка лекцыі альбо праводзіліся ў «Zoom», альбо матэрыялы падаваліся на сайце сістэмы электроннага навучання. Таксама на апошнім выкладваліся практычныя заданні і лабараторныя работы. Мы выконвалі іх самастойна, а абарона праходзіла ў любых галасавых чатах («Discord», «Skype», «Zoom»). Мне здаецца, што «дыстанцыёнка» не паўплывала на якасць адукацыі, бо ў ёй ёсць вялікія перавагі: слухаць лекцыі ў «Zoom» больш зручна, чым у аўдыторыі. Ніхто не перашкаджае. Усё добра відаць і чуваць. Аднак пры навучанні ў такім фармаце значна павялічылася колькасць матэрыялаў і заданняў для самападрыхтоўкі. Каб не губляць якасць адукацыі, трэба гнаць ляноту і сачыць за самадысцыплінай. Я наогул фанат анлайн-навучання. Таму менавіта мне было камфортна атрымліваць веды ў такім фармаце. Але, калі казаць пра атрыманне вышэйшай адукацыі, я лічу, што зусім без аўдыторных заняткаў абысціся нельга...

**Анастасія ФЁДАРАВА, студэнтка IV курса лячэбнага факультэта БДМУ:**

— У сувязі са спецыфікай навучання ў медуніверсітэце, якая заключаецца ў тым, што большасць пар праходзяць у розных бальніцах, і нам даводзіцца шмат ездзіць у грамадскім транспарце, нас перавялі на «дыстанцыёнку» вельмі хутка. Але мінусаў у ёй нямала, асабліва для студэнта-медыка. Наш працэс навучання непарыўна звязаны з кантактамі з пацыентамі, з медустановамі. На практычных занятках у нас шмат практыкі: мы ўдзельнічаем у аглядах, выкарыстоўваем інструментальныя метады даследавання, бываем на аперацыях, родах. Гэта велізарны пласт інфармацыі, які трэба ведаць кожнаму будучаму доктару, і пры жывым кантакце ён запамінаецца нашмат лягчэй. Пры дыстанцыйным навучанні такое немагчыма арганізаваць. Ці губляецца якасць адукацыі? Гэта залежыць ад студэнта. Калі ён зацікаўлены ў навучанні, то не. А, можа, нават і паляпшаецца, бо ў яго з'явілася больш вольнага часу, каб аддаць увагу тым дысцыплінам, якія яму падабаюцца або з якімі ў будучыні хоча звязаць сваё жыццё.

**Анастасія ШАРАПАВА, студэнтка II курса факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ:**

— Напачатку дыстанцыйнае навучанне ў нас праводзілася выключна на адукацыйным партале, праз чаты. Заданні мы скідвалі і на партал, і на пошту выкладчыкаў. Але з цягам часу многія заняткі сталі праходзіць у фармаце відэаканферэнцый, бо так больш зручна. Мне зусім не падабалася чытаць змест лекцыі праз чат. Гэта ж проста сухі тэкст! Значна больш цікава слухаць лекцыю, калі выкладчык яе вядзе менавіта перад студэнтамі. Больш зразумела, зацягвае. Заняткі па аўдыя- і відэасувязі спадабаліся.

На маю думку, якасць навучання згубілася б, калі б мы працягвалі працаваць праз чаты. А вось розніцы паміж заняткамі ў «Zoom» і рэальнымі не адчула. І там, і там рыхтуешся, адказваеш, слухаеш. Прычым на «дыстанцыёнцы» кожны адказвае за сябе (ва ўсіх студэнтаў асабістае заданне, якое неабходна выканаць цягам пары або пасля яе). Прапусціць лекцыю міма вушэй, як гэта бывае ва ўніверсітэце (пакуль іншы адказвае, ты адседжваешся на апошняй парце і смяешся з сябрамі), не атрымаецца.

Але былі і мінусы — велізарная колькасць заданняў і дэдлайны, якія зваліліся на студэнтаў. Нагрузка была вельмі вялікая, большая, чым падчас звычайнай вучобы.

Па выніках у мяне склалася ўражанне, што дыстанцыйнае навучанне — гэта даволі нядрэнная практыка. Аднак у нас яна аказалася недапрацаванай. Пакуль усе адаптаваліся, разабраліся, знайшлі найлепшыя спосабы для ўзаемадзеяння, прайшло даволі шмат навучальнага часу, які пры наладжанай сістэме можна было правесці з нашмат большай карысцю.

**Аляксандра МЯЦЕЛЬСКАЯ, студэнтка III курса прыборабудаўнічага факультэта БНТУ:**

— Спачатку працавалі праз электронную пошту. Потым некаторыя заняткі сталі праводзіцца па відэасувязі ў праграме «Microsoft Teams». У ёй выкладчыкі прымацоўвалі заданні, мы выконвалі іх і таксама прымацоўвалі дзеля праверкі. Даволі зручны фармат, бо не трэба нікуды спяшацца: пад рукой смартфон або камп'ютар — і ты на сувязі. Але ёсць моманты, якія ад цябе не залежаць. Якасць карцінкі на экране, гуку, хуткасці інтэрнэту... У кагосьці не было камеры, у некага не працаваў мікрафон і даводзілася пісаць пісьмы ў чат... Нават некаторым выкладчыкам было складана разабрацца ў рабоце праграмы. Часам такія тэхнічныя моманты перашкаджалі заняткам, і якасць навучання гублялася. Складана было растлумачыць сваё пытанне, выкладчыкі фізічна не маглі хутка адказваць усім. Шмат тэм даводзілася вывучаць самастойна, а па некаторых прадметах без падрабязнага тлумачэння нешта зразумець вельмі складана. Значна павялічыўся аб'ём работы. Было сапраўды цяжка.

Я для сябе не вырашыла, які фармат мне падабаецца больш. Хутчэй за ўсё, калі б перада мной паўстаў выбар, пакінула б звычайны непасрэдна ў ВНУ.

...Кожнаму з апытаных студэнтаў не хапала звычайных універсітэцкіх будняў, сустрэч з сябрамі. Але ёсць і станоўчы момант: ВНУ справіліся, мабілізаваліся і арганізавалі дыстанцыйнае навучанне, якое няхай і нязвыклае для нас, але даволі эфектыўнае. Досвед, які атрымалі вышэйшыя навучальныя ўстановы, дапаможа ў будучыні арганізоўваць розныя віды навучання і камбініраваць розныя практыкі.

**Паліна ПРАКАПЕНЯ, студэнтка II курса факультэта журналістыкі БДУ.**
**Фота аўтара.**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
18 06 2020 г.

# БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ

## ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ (ДНЕВНУЮ, ЗАОЧНУЮ И В ФОРМЕ СОИСКАТЕЛЬСТВА) И ДОКТОРАНТУРУ (ДНЕВНУЮ И В ФОРМЕ СОИСКАТЕЛЬСТВА) ДЛЯ ПОЛУЧЕНИЯ ПОСЛЕВУЗОВСКОГО ОБРАЗОВАНИЯ В 2020 ГОДУ

### План приема лиц для получения послевузовского образования за счет средств республиканского бюджета на 2020 год в Белорусском государственном университете

| Организация-заказчик | Шифр специальности | АСПИРАНТУРА Всего | Из них по форме обучения: Дневная | Заочная | Соискательство | ДОКТОРАНТУРА Всего | Из них по форме обучения: Дневная | Соискательство |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Организация-исполнитель | 01.01.01 | 2 | 2 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 01.01.02 | 1 | 1 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 01.01.06 | 1 | 1 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 01.01.09 | | | | | 1 | | 1 |
| Организация-исполнитель | 01.02.04 | 2 | 2 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 01.02.05 | 1 | 1 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 01.02.08 | 1 | 1 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 01.04.01 | | | | | 1 | 1 | |
| Организация-исполнитель | 01.04.02 | 3 | 3 | | | 1 | 1 | |
| Организация-исполнитель | 01.04.03 | 1 | | | 1 | | | |
| Организация-исполнитель | 01.04.05 | 3 | 2 | | 1 | 2 | 2 | |
| Организация-исполнитель | 01.04.10 | | | | | 1 | 1 | |
| Организация-исполнитель | 01.04.16 | 1 | 1 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 02.00.01 | 1 | 1 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 02.00.02 | 2 | 2 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 02.00.04 | 2 | 2 | | | 2 | 2 | |
| Организация-исполнитель | 02.00.06 | 2 | 2 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 02.00.09 | 1 | 1 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 03.01.02 | 1 | 1 | | | 2 | 2 | |
| ЧТУП «Вижиндизайн» | 03.01.05 | 1 | | | 1 | | | |
| Организация-исполнитель | 03.01.05 | 1 | 1 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 03.01.06 | | | | | 1 | | 1 |
| Организация-исполнитель | 03.01.07 | 3 | 3 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 03.02.03 | 1 | 1 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 03.02.08 | 1 | 1 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 03.02.10 | | | | | 2 | 2 | |
| Организация-исполнитель | 05.13.01 | 3 | 3 | | | 1 | 1 | |
| Белорусский институт стратегических исследований | 05.13.01 | 1 | | | 1 | | | |
| Организация-исполнитель | 05.13.17 | 2 | 2 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 05.13.18 | 1 | 1 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 05.13.19 | 1 | 1 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 05.25.02 | 2 | 2 | | | | | |
| Министерство экономики Республики Беларусь | 05.25.02 | 1 | | | 1 | | | |
| Организация-исполнитель | 07.00.02 | 7 | 5 | | 2 | | | |
| УО «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы» | 07.00.02 | | | | | 2 | 2 | |
| УО «Гомельский государственный университет имени Франциска Скорины» | 07.00.02 | 1 | 1 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 07.00.03 | 6 | 6 | | | | | |
| УО «Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова» | 07.00.03 | 1 | 1 | | | 1 | 1 | |
| Организация-исполнитель | 07.00.06 | 1 | 1 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 07.00.07 | 2 | 2 | | | | | |
| УО «Брестский государственный университет имени А. С. Пушкина» | 07.00.07 | 1 | 1 | | | | | |
| УО «Полоцкий государственный университет» | 07.00.07 | 1 | 1 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 07.00.09 | 1 | 1 | | | | | |
| Учреждение «Белорусский научно-исследовательский институт документоведения и архивного дела» | 07.00.09 | 2 | | 2 | | | | |
| Организация-исполнитель | 07.00.15 | 2 | 2 | | | | | |
| ГНУ «Институт истории Национальной академии наук Беларуси» | 07.00.15 | | | | | 1 | | 1 |
| Белорусский национальный технический университет | 08.00.01 | | | | | 1 | | 1 |
| Организация-исполнитель | 08.00.05 | 3 | 2 | | 1 | 2 | 2 | |
| УО «Гомельский государственный университет имени Франциска Скорины» | 08.00.05 | 1 | 1 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 08.00.13 | 2 | 2 | | | | | |
| УО «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы» | 08.00.13 | | | | | 1 | 1 | |
| Организация-исполнитель | 08.00.14 | 3 | 2 | | 1 | 2 | 2 | |
| Министерство иностранных дел Республики Беларусь | 08.00.14 | 1 | | | 1 | | | |
| ГУО «Республиканский институт высшей школы» | 08.00.14 | | | | | 1 | 1 | |
| Организация-исполнитель | 09.00.01 | 1 | 1 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 09.00.03 | 1 | 1 | | | | | |
| УО «Белорусский государственный университет информатики и радиоэлектроники» | 09.00.03 | | | | | 1 | | 1 |
| УО «Белорусский государственный медицинский университет» | 09.00.05 | 1 | | | 1 | | | |
| Организация-исполнитель | 09.00.11 | 1 | 1 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 10.01.01 | | | | | 2 | 2 | |
| Учреждение «Государственный музей истории белорусской литературы» | 10.01.01 | 1 | 1 | | | | | |
| ГУО «Гимназия № 28 г. Минска» | 10.01.02 | 1 | | 1 | | | | |
| Минский молодежный культурно-спортивный центр «Пируэт» | 10.01.02 | 1 | 1 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 10.01.03 | 3 | 3 | | | 1 | | 1 |
| Организация-исполнитель | 10.01.08 | 2 | | 1 | 1 | | | |
| Организация-исполнитель | 10.01.10 | 6 | 5 | | 1 | 2 | 1 | 1 |
| ООО «МедиаГрупп Гревцова» | 10.01.10 | 1 | | | 1 | | | |
| КУП «Телерадиовещательный канал «Гродно Плюс» | 10.01.10 | 1 | | | 1 | | | |
| Организация-исполнитель | 10.02.01 | 1 | 1 | | | | | |
| УО «Витебский государственный университет имени П. М. Машерова» | 10.02.02 | | | | | 1 | 1 | |
| Организация-исполнитель | 10.02.19 | 3 | 1 | | 2 | | | |
| УО «Полесский государственный университет» | 10.02.19 | 1 | | 1 | | | | |
| УО «Минский государственный лингвистический университет» | 10.02.19 | 1 | | | 1 | | | |
| ГНУ «Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы Национальной академии наук Беларуси» | 12.00.01 | | | | | 1 | 1 | |
| Белорусский национальный технический университет | 12.00.01 | 1 | 1 | | | | | |
| ООО «Фактория» | 12.00.01 | 1 | 1 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 12.00.02 | 1 | | 1 | | 1 | 1 | |
| Академия управления при Президенте Республики Беларусь | 12.00.02 | | | | | 1 | 1 | |
| УО «Институт предпринимательской деятельности» | 12.00.02 | | | | | 1 | 1 | |
| Организация-исполнитель | 12.00.03 | 5 | 5 | | | 2 | 1 | 1 |
| Адвокатское бюро «Горецкий и партнеры» | 12.00.03 | 1 | 1 | | | | | |
| Национальный центр законодательства и правовых исследований Республики Беларусь | 12.00.03 | | | | | 1 | | 1 |
| Адвокатское бюро «РЕВЕРА» | 12.00.03 | 1 | 1 | | | | | |
| АБ «Сорайнен» | 12.00.03 | 1 | 1 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 12.00.04 | 3 | 2 | | 1 | | | |
| ООО «ЮрСтиль» | 12.00.04 | 1 | 1 | | | | | |
| УО «Полоцкий государственный университет» | 12.00.04 | 1 | | 1 | | | | |
| УО «Белорусский государственный экономический университет» | 12.00.05 | | | | | 1 | | 1 |
| Организация-исполнитель | 12.00.06 | | | | | 1 | 1 | |
| ГНУ «Институт экономики Национальной академии наук Беларуси» | 12.00.06 | 1 | 1 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 12.00.08 | 1 | 1 | | | 1 | | 1 |
| УО «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы» | 12.00.08 | | | | | 1 | 1 | |
| УО «Белорусская государственная орденов Октябрьской Революции и Трудового Красного Знамени сельскохозяйственная академия» | 12.00.08 | 1 | | | 1 | | | |
| Организация-исполнитель | 12.00.09 | 1 | 1 | | | 1 | 1 | |
| Организация-исполнитель | 12.00.10 | 3 | 3 | | | 2 | 2 | |
| УО «Полоцкий государственный университет» | 12.00.10 | 1 | 1 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 12.00.12 | 1 | 1 | | | | | |
| Следственный комитет Республики Беларусь Центральный аппарат | 12.00.12 | 1 | | 1 | | 1 | 1 | |
| УО «Могилевский институт Министерства внутренних дел Республики Беларусь« | 12.00.12 | 1 | | 1 | | | | |
| ГУО «Институт бизнеса БГУ» | 12.00.13 | 1 | 1 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 12.00.13 | | | | | 1 | 1 | |
| Экономический суд Брестской области | 12.00.14 | 1 | | | 1 | | | |
| УО «Академия Министерства внутренних дел Республики Беларусь» | 12.00.14 | | | | | 1 | | 1 |
| УО «Полоцкий государственный университет» | 12.00.14 | 1 | 1 | | | | | |
| УО «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы» | 12.00.14 | 1 | 1 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 12.00.14 | 1 | 1 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 12.00.15 | 1 | 1 | | | 1 | 1 | |
| УО «Белорусская государственная орденов Октябрьской Революции и Трудового Красного Знамени сельскохозяйственная академия» | 12.00.15 | 1 | | | 1 | | | |
| ЧУП «СНАВ» | 12.00.15 | 1 | 1 | | | | | |
| Минская городская нотариальная контора № 1 Первомайского района Белорусской нотариальной палаты | 12.00.15 | 1 | 1 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 13.00.01 | 2 | 1 | | 1 | | | |
| Организация-исполнитель | 13.00.02 | 3 | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 | |
| УО «Гимназия с белорусским языком обучения № 23 г. Минска» | 13.00.02 | 1 | | | 1 | | | |
| УО «Средняя школа № 129 г. Минска» | 13.00.02 | 1 | | 1 | | | | |
| Организация-исполнитель | 13.00.04 | 2 | | | 2 | | | |
| УО «Брестский государственный университет имени А. С. Пушкина» | 19.00.01 | | | | | 1 | 1 | |
| УО «Барановичский государственный университет | 19.00.05 | | | | | 1 | 1 | |
| УО «Гомельский государственный университет имени Франциска Скорины» | 19.00.05 | | | | | 1 | 1 | |
| Организация-исполнитель | 19.00.05 | 8 | 7 | 1 | | | | |
| УО «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы» | 22.00.01 | | | | | 1 | 1 | |
| ГУО «Гродненский областной институт развития образования» | 22.00.01 | 1 | 1 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 22.00.01 | 1 | 1 | | | 2 | 2 | |
| Организация-исполнитель | 22.00.08 | 2 | 1 | | 1 | 1 | 1 | |
| УО «Гомельский государственный университет имени Франциска Скорины» | 23.00.02 | | | | | 1 | 1 | |
| Организация-исполнитель | 23.00.02 | 2 | 2 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 23.00.04 | 1 | 1 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 23.00.05 | 1 | 1 | | | 1 | | 1 |
| Организация-исполнитель | 24.00.01 | 1 | | | 1 | | | |
| ГУ «Национальный исторический музей Республики Беларусь» | 24.00.03 | 1 | 1 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 25.03.01 | 2 | 2 | | | | | |
| Организация-исполнитель | 25.03.02 | 1 | 1 | | | | | |
| УО «Минский государственный лингвистический университет» | 25.03.02 | 1 | | | 1 | | | |
| **ИТОГО:** | | **171** | **129** | **12** | **30** | **60** | **47** | **13** |

Лица, поступающие в аспирантуру для обучения в дневной или заочной форме получения образования, сдают вступительный экзамен по специальной дисциплине.

Кандидатские экзамены и зачет по общеобразовательным дисциплинам должны быть сданы до поступления в аспирантуру.

Для получения послевузовского образования в аспирантуре в форме соискательства сдача вступительного экзамена не требуется. Наличие сданных кандидатских экзаменов по общеобразовательным дисциплинам не обязательно.

Лица, поступающие в аспирантуру для обучения в заочной форме получения образования и в форме соискательства должны иметь опыт практической работы не менее двух лет на должностях, требующих наличия высшего образования.

**Подробная информация по правилам приема на сайтах БГУ (http://www.research.bsu.by; http://www.bsu.by) или по телефонам: +37517 209-51-73, +37517 209-50-24.**

**Прием документов осуществляется с 1 августа по 30 сентября 2020 года по адресу: г. Минск, ул. Бобруйская, 9, к. 414, 419.**

Время работы отдела аспирантуры и докторантуры: понедельник–четверг с 8.30 до 13.00 и с 13.45 до 17.15, пятница с 8.30 до 13.00 и с 13.45 до 17.00.

УНП 100235722

Учреждение образования

## «Республиканский институт профессионального образования»

## ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ

на 2020/2021 учебный год

**по специальности 13.00.08 «Теория и методика профессионального образования»**

Количество мест определено в соответствии с контрольными цифрами приема:
**заочная форма обучения – 1,**
**соискательство – 4.**

**Прием документов осуществляется**
**с 1 августа по 30 сентября 2020 года**
**по адресу: 220004, г. Минск, ул. К. Либкнехта, 32, к. 116.**

Телефон для справок **(017) 215 07 07.**

УНП 100419924

---

**Учреждение образования Федерации профсоюзов Беларуси «Международный университет «МИТСО»**

## ОБЪЯВЛЯЕТ НАБОР В АСПИРАНТУРУ НА ПЛАТНОЙ ОСНОВЕ ПО СПЕЦИАЛЬНОСТЯМ:

**08.00.05** – экономика и управление народным хозяйством;
**12.00.03** – гражданское право; предпринимательское право; семейное право; международное частное право;
**12.00.05** – трудовое право; право социального обеспечения;
**12.00.10** – международное право; европейское право.

***Формы и сроки обучения:***
- аспирантура (дневная форма) – до трех лет;
- аспирантура (заочная форма) – до четырех лет;
- соискательство – до пяти лет;
- соискательство в целях сдачи кандидатских экзаменов и кандидатских зачетов (дифференцированных зачетов) – до двух лет.

***Прием документов – с 1 августа по 30 сентября 2020 года***
**Наш адрес: 220099, г. Минск, ул. Казинца, 21, к. 3**
